

«КРОПКА АДЛІКУ» — У МІНСКУ 8

А ЦІ НАСТАНЕ «ЗАЎТРА»? 9





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ВЕРАСНЯ 2018 г. СУБОТА № 178 (28794)


## ЛІЧБА ДНЯ

**40 %**

*насельніцтва краіны, у тым ліку да 75 % — з груп рызыкі, плануецца прышчапіць сёлета супраць грыпу. Цяпер завяршаецца падрыхтоўчы этап да правядзення вакцынацыі. Прышчапляць на бясплатнай аснове будуць з выкарыстаннем вакцыны «Грыпол Плюс» (Расія), для вакцынацыі на платнай аснове будуць даступныя вакцыны іншых вытворцаў. Высокаспецыфічны імунітэт фарміруецца праз 7—14 дзён пасля вакцынацыі, захоўваецца ён да 6—12 месяцаў. Завяршыць кампанію плануецца да 1 снежня. Усе вакцыны зарэгістраваныя і дазволеныя да выкарыстання на тэрыторыі Беларусі.*

# Месца працы — лес



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кіраўнік Валяр'янаўскага лясніцтва Іван ЛОШЧ — самы малады ляснічы ва Уздзенскім лягасе, але ў той жа самы час досведу яму не займаць. Нягледзячы на свой малады ўзрост — Івану Віктаравічу толькі дваццаць восем, — паспеў скончыць дзве навучальныя ўстановы па сваёй прафесіі — Полацкі лясны каледж і Беларускі тэхналагічны ўніверсітэт, мае дыплом інжынера лясной гаспадаркі. Акрамя таго, па сваёй кар'ернай лесвіцы Іван Лошч прайшоў усе прыступкі лясной вытворчасці — ад лесніка, майстра лесу да памочніка ляснічага, ведае ўсе тонкасці лясной справы. Сваю працоўную дзейнасць Іван пачынаў і працягвае на Уздзеншчыне, сёлета яму даверылі кіраваць адным з найлепшых лясніцтваў лягаса.

■ Прыцягненне

## КОСМАС ВЫБІРАЕ МЭТАНАКІРАВАНЫХ

### Будучы «заваёўнік» Марса ўжо вучыцца ў школе...

**Да апошняга тыдня шанцы большасці беларусаў сустрэцца асабіста з касманаўтам, а тым больш з астранаўтам ці тайканаўтам, раўняліся нулю. Канешне, нашы землякі Пётр Клімук, Уладзімір Кавалёнак і Алег Навіцкі радзіму не забываюць. Але ж ці могуць іх візіты ахапіць усіх, каго цікавіць касмічная тэма? Звычайна, калі мы хочам падкрэсліць невыканальнасць задачы, кажам: «Не прасцей, чым трапіць у космас...» Тым не менш, пачынаючы з палёту Гагарына, на калязямной арбіце пабывала ўжо каля 600 чалавек. І амаль 90 з іх прыехалі ў Беларусь для ўдзелу ў XXXI Міжнародным кангрэсе ўдзельнікаў касмічных палётаў.**

СТАР. 4

## НАЙЛЕПШЫ Ў СВЕЦЕ КАСЦЮМ...

### або Чаго хочуць мужчыны?



**Мадэльер Дзмітрый ЗАБАЛОТНЫ быў адным з першых у Беларусі, хто пачаў выраблць на заказ мужчынскія касцюмы прэміум-класа. Сёння яго студыя вядомая многім знакамітым і паспяховым беларусам, а касцюмы складаюць канкурэнцыю сусветна вядомым брэндам. Дзмітрый расказаў, у якіх выпадках не абысціся без класічнага касцюма, што павінна быць у гардэробе кожнага мужчыны і чым трэба кіравацца, яго фарміруючы, а таксама чаму важна разумець мову дрэс-коду.**

### І МАСТАЦТВА, І РАМЯСТВА

*— Дзмітрый, што абумовіла ваш выбар прафесіі?*

— З дзяцінства я цікавіўся мастацтвам, і гэта своеасаблівая спадчыннасць ад бацькі, які ў свой час вывучаў у Ленінградзе жывапіс, спевы, філасофію. У дзяцінстве я гадзінамі мог гартаць альбомы жывапісу, таго ж Віктара Васняцова — з пачатку да канца і зноў з канца да пачатку. У дзіцячым садку на ўсіх ранішніках мяне ставілі салістам. Пасля вучыўся ў музычным ліцэі пры кансерваторыі, на аддзяленні харавога дырыжыравання, пазней пачалася спецыялізацыя — фартэпіяна, валторна. А гэта экзамены, канцэрты і прыгожыя сцэнічныя касцюмы. У нас, хлопцаў, любімым месцам было закуліссе опернага тэатра, я дагэтуль памятаю ўсе чорныя хады, хоць там і прайшла рэканструкцыя. Мы з захапленнем глядзелі на сцэнічныя дэкарацыі, касцюмы, балерын, салістаў.

СТАР. 7

## КОРАТКА

● На кансорцыуме Genome 10K у Нью-Ёрку абвясцілі аб запуску міжнароднага праекта «Геномы пазваночных», задача якога — сабраць геномы ўсіх 66 тыс. відаў пазваночных, якія жывуць на Зямлі.

● **Магіла вядомага беларускага мастака, фальклрыста, этнографа Язэпа Драздовіча стала гісторыка-культурнай каштоўнасцю.**



● Чатыры аўтамабілі хуткай меддапамогі паступілі ў распараджэнне падстанцый да Дня горада ў Гомелі.

● **У Беларусі вызначаны пералік прафесій, па якіх будуць навучацца старшакласнікі на ўроках працы. Сярод іх — бетоншчык, ганчар, афіцыянт, візажыст, рэкламны агент, сакратар.**

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!**

**Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2018 года!**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# ЭФЕКТЫЎНЫ ВІЗІТ

**Афіцыйны візіт кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан завяршыўся. У аэрапорт Прэзідэнт прыбыў з рэзідэнцыі ўзбекскага лідара «Кайнарсай». Аляксандр Лукашэнка стаў першым замежным кіраўніком дзяржавы, які наведаў асабістую рэзідэнцыю Шаўката Мірзіёева. Там прэзідэнты працягнулі перамовы ў нефармальных абставінах, а пасля — за рабочым сняданкам, дзе яны абменьваліся меркаваннямі больш за тры гадзіны.**


Фота БелТА.

Днём раней Аляксандр Лукашэнка і Шаўкат Мірзіёеў правялі перамовы, па выніках якіх было падпісана 16 дакументаў. У той жа дзень кіраўнікі дзвюх дзяржаў адкрылі выстаўку беларускіх вытворцаў Made in Belarus. Экспазіцыя расказвае пра развіццё такіх галін, як машынабудаўніцтва, транспарт, хімія і нафтахімія, будаўніцтва, сельская гаспадарка, ахова здароўя, навука, адукацыя, спорт і іншае. На выстаўцы прэзідэнты абмеркавалі з бізнесменамі магчымыя сумесныя праекты і далі адказным асобам даручэнні іх прапрацаваць. У прыватнасці, размова ішла пра пастаўку прадукцыі, арганізацыю зборачных і перапрацоўчых вытворчасцяў, стварэнне лагістычных цэнтраў. Таксама Аляксандр Лукашэнка і Шаўкат Мірзіёеў наведалі цырымонію адкрыцця новага вытворчага корпуса беларуска-ўзбекскага прадпрыемства «Амкадор-Агратэхмаш».

**Паводле БелТА.**

## Паспяховыя старты ў Мехіка

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў членаў нацыянальнай каманды Беларусі па сучасным пяціборʼі Настассю Пракапенку і Ірыну Прасянцову з выдатным выступленнем на чэмпіянаце свету па сучасным пяціборʼі ў Мехіка, паведаміла прэс-служба беларускага лідара.**



«Залаты медаль Настассі ў асабістым алімпійскім відзе праграмы і ваша сумесная перамога ў эстафеце пацвярджаюць высокі ўзровень айчыннай школы сучаснага пяціборʼя. «Вы — малайцы! — гаворыцца ў віншаванні. — Як і шматлікія беларускія балельшчыкі, спадзяюся, што нашы прадстаўнікі гэтага віду спорту гэтак жа ярка і паспяхова выступяць на Алімпіядзе ў Токіа ў 2020 годзе».

Кіраўнік дзяржавы пажадаў спартсменкам і ўсёй камандзе моцнага здароўя і ўдачы.

Дарэчы, лідару зборнай Беларусі па сучасным пяціборʼі Настассі Пракапенцы ўчора ўручана бронзавая ўзнагарода Алімпіяды 2008 года ў Пекіне.

У сталіцы Кітая дзесяць гадоў таму беларуска заняла чацвёртае месца, саступіўшы трэцяе месца на пʼедэстале ўкраінцы Вікторыі Церашчук. Аднак допінг-проба ўкраінскай спартсменкі пасля пераправеркі аналізаў дала станоўчы вынік на анабалічныя стэроіды.

У адпаведнасці з рашэннем Міжнароднага алімпійскага камітэта ўзнагарода перададзена прадстаўніцы Беларусі Настассі Пракапенцы.

Уручэнне медаля адбылося падчас чэмпіянату свету па сучасным пяціборʼі ў Мехіка (Мексіка), дзе спартсменка заваявала «золата» ў асабістым заліку і жаночай эстафеце. Такім чынам, у медальнай скарбонцы Беларусі ў Пекіне-2008 стала 14 узнагарод (3—4—7).

## Ордэн знайшоўся праз 75 гадоў

**Пошукавыя атрады, якія працуюць у нашай краіне, дагэтуль адкрываюць таямніцы, якія з ваенных часоў захоўвае зямля. Нядаўна член ваенна-гістарычнага клуба «Пошук» Андрэй Емяльяненка знайшоў ордэн Александра Неўскага ў лесе каля вёскі Давыдавічы ў Калінкавіцкім раёне Гомельскай вобласці. У 1943 годзе тут ішлі вельмі моцныя баі. Пошукавік збіраў інфармацыю пра няўлічаныя вайсковыя захаванні.**

А ўчора міністр абароны Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнант Андрэй Раўкоў перадаў Герою Савецкага Саюза лётчыку-касманаўту Аляксандру Віктарэнку гэтую ўзнагароду. 75 гадоў таму яе атрымаў дзядзька касманаўта, старшы лейтэнант Іван Віктарэнка.

— Камандзір роты 69-га стралковага палка старшы лейтэнант Іван Віктарэнка быў прадстаўлены да ўзнагароджання ордэнам Чырвонай Зоркі, але камандуючы 65-й арміяй асабіста на ўзнагародным лісце наклаў рэзалюцыю аб узнагароджанні ордэнам Аляксандра Неўскага, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны. — З узнагароднага ліста вынікае, што ў раёне вёскі Жыцы Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці мінамётная рота пад камандаваннем старшага лейтэнанта Івана Віктарэнкі паспяхова фарсіравала Дняпро. Дзякуючы выразнаму кіраўніцтву ўсё падраздзяленне, матэрыяльная частка і боепрыпасы былі хутка і без страт перапраўленыя на правы бераг. У далейшым камандзір роты арганізаваў умелае вядзенне агню па агнявых пунктах саперніка. Тым самым было забяспечана паспяховае прасоўванне пяхоты. Пры адбіцці контратакі агнём мінамётаў Іван Віктарэнка бязлітасна знішчаў гітлераўцаў і забяспечыў поспех бою.

Іван Віктарэнка загінуў праз месяц пасля гэтых падзей у адным з жорсткіх баёў.

**Валярʼян ШКЛЕННІК.**

## ■ Тры пытанні да ўлады

## Налета — выхад на самафінансаванне



**Пухавіцкі раён размясціўся ў самым сэрцы Беларусі. Менавіта тут, паблізу вёскі Антанова, знаходзіцца геаграфічны цэнтр краіны. Пра сённяшні дзень раёна і планы на будучыню старшыня Пухавіцкага раённага выканаўчага камітэта Сяргей ЛЕНКАВЕЦ расказаў «Звяздзе».**

***— Вядома, што ў вашым раёне адзін з самых нізкіх паказчыкаў беспрацоўя ў вобласці. І гэта не дзіўна, бо зарплаты тут набліжаюцца да сталічных...***

— Наш рэгіён ужо перавыканаў многія планы і заданні па 2018 год. Створана 150 новых працоўных месцаў пры запланаваных 102. Узровень беспрацоўя ў раёне складае 0,7 %. Пры гэтым сярэдні заробак у сельскай гаспадарцы — 670 рублёў, а агульны па рэгіёне за першае паўгоддзе гэтага года — 812 рублёў.

Вы спытаеце, чаму. На тэрыторыі рэгіёна знаходзіцца 17 прамысловых прадпрыемстваў, і яны прыносяць добры прыбытак. За першае паўгоддзе 2018 года падатковыя паступленні ў мясцовы бюджэт ад прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу ў Пухавіцкім раёне склалі 290 мільярдаў рублёў. Сёння перад прадпрыемствамі стаіць задача замацавання са сваёй прадукцыяй на рынках СНД. Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі ў іх на цяперашні момант зʼяўляюцца Расія, Кітай, Украіна, Польшча і Літва. Варта адзначыць, што ў гэтым годзе прамыя замежныя інвестыцыі толькі за паўгода склалі 44 мільёны долараў пры заданні ў 19 мільёнаў у год. Сёлета наш рэгіён ушчыльную наблізіўся да поўнага самафінансавання, а з 2019 года Пухавіцкі раён перастане быць датацыйным.

Актыўна развіваецца дробны і сярэдні бізнэс. У бягучым годзе зарэгістравана 117 індывідуальных прадпрымальнікаў, у мінулым годзе за аналагічны перыяд гэты паказчык склаў 98. У бюджэт ад прадпрымальніцкага сектара ўжо паступіла 23,5 мільёна рублёў. Летась за такі ж перыяд раённы бюджэт атрымаў 13,5 мільёна рублёў.

Нас цікавяць інвестары, якія хочуць працаваць у Пухавіцкім раёне, у якіх ёсць перспектыўная ідэя для вытворчасці. Спадзяёмся, што дзякуючы новым прадпрыемствам будуць арганізаваныя новыя працоўныя месцы з добрай заработнай платай.

***— Кажуць, у вас развіваецца такі новы кірунак у медыцыне, як платныя паслугі для замежнікаў?***

— У раённага медабслугоўвання ёсць альтэрнатыўныя крыніцы даходаў. Цяпер трэба проста ўмець іх узяць. Так, большасць замежнікаў маюць медыцынскую страхоўку. Аказваючы медыцынскую дапамогу замежным грамадзянам, мы атрымліваем ад страхавых кампаній грашовыя сродкі. За кошт супрацоўніцтва з гэтымі страхавымі кампаніямі за сем мінулых месяцаў у бюджэт раёна паступіла ўжо больш за 7,5 тысячы долараў.

Таксама дзякуючы паспяховай працы ў нас ёсць магчымасць накіроўваць рэсурсы на развіццё сацыяльнай сферы — мы клапоцімся пра адукацыю, медыцыну і жыллёва-камунальную гаспадарку. У Пухавіцкім раёне працуе 54 навучальныя ўстановы, у тым ліку 24 школы і 18 дзіцячых садоў. Прычым адміністрацыя раёна дбае не толькі пра інфраструктуру ўстаноў адукацыі, але і пра атрыманне якасных ведаў.

Не менш значнае і пытанне аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву Пухавіцкага раёна. У раёне працуе 40 устаноў медыцынскай дапамогі. Аднак цэнтральным месцам аказання меддапамогі зʼяўляецца менавіта раённая бальніца, дзе неўзабаве завяршаецца рэканструкцыя пяціпавярховага корпуса. Тут размешчана шэсць аддзяленняў на 226 бальнічных месцаў.

***— Раскажыце пра перспектывы турызму ў рэгіёне.***

— Найбольш цікавымі для турыстаў, зразумела, будуць два буйныя комплексы — «Дудуткі» і «Дукорскі маёнтак». Але ёсць і іншыя абʼекты, якія могуць прыцягнуць турыстаў і экскурсантаў. У Марʼінай Горцы, напрыклад, захавалася сядзіба міністра ўнутраных спраў Расіі Льва Макава. Яна пабудавана ў другой палове XIX стагоддзя і лічыцца помнікам эклектычнай архітэктуры. У пачатку XX стагоддзя ў гэтым будынку размяшчаўся Дом творчасці пісьменнікаў Беларусі. Тут некаторы час працавалі класікі беларускай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас. У раёне 25 аграсядзіб, якія за мінулы год прынялі больш за 14 тысяч гасцей. Сёння ідзе актыўная работа па стварэнні кластара і канцэпцыі па развіцці турызму.

**Сяргей КУРКАЧ**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Тэрэзу Мэй вырашылі адправіць у адстаўку

Каля 50 брытанскіх парламентарыяў-кансерватараў правялі сустрэчу, на якой абмеркавалі адстаўку прэмʼер-міністра Тэрэзы Мэй. Пра гэта паведамляе gazeta.ru са спасылкай на Sky News. Галоўная прычына незадаволенасці цяперашнім прэмʼерам — гэта адсутнасць выразнага плана і ўмоў па выхадзе Брытаніі з Еўрасаюза. BBC таксама паведамляе пра бунт кансерватараў супраць Мэй. «Усе, каго я ведаю, кажуць, што яна павінна сысці», «яна катастрофа» і «гэта не можа працягвацца», кажуць суразмоўцы тэлекарпарацыі. Для адстаўкі Мэй неабходна набраць 48 заяў ад парламентарыяў з патрабаваннем вынесці вотум недаверу прэмʼеру. Гэтае пытанне можа быць узнята публічна на працягу некалькіх тыдняў.

### На Філіпінах больш за 820 тысяч чалавек эвакуіруюць з-за супертайфуну

Пра гэта паведамляе агенцтва «Сіньхуа» са спасылкай на мясцовыя ўлады. Па словах прадстаўніка Нацыянальнага савета па зніжэнні рызык і кіраванні катастрофамі (NDRRMC) Эдгара Пасадас, праходзіць «папераджальная эвакуацыя» раёнаў, якія будуць знаходзіцца ў зоне разгулу стыхіі. Выканаўчы дырэктар NDRRMC Рыкарда Джалад удакладніў,



што гаворка ідзе пра эвакуацыю каля 824 тысяч чалавек у правінцыях Кагаян, Ісабель, Апаяа, Абра, Іфугаа, Паўднёвы Ілокас, Паўночны Ілокас і Горнай правінцыі. Улады заклікалі ўсіх, хто знаходзіцца ў зоне тайфуну, схавацца ў цэнтрах эвакуацыі, падкрэсліўшы, што «Мангхут» можа стаць прычынай сурʼёзных разбурэнняў, а таксама справавакаваць паводкі і апоўзні. Тайфун наблізіўся да Філіпінаў у сераду. Было абвешчана штармавое папярэджанне. Чакаецца, што сёння ён дасягне максімальнай сілы, перадае Філіпінскае ўпраўленне атмасферных, геафізічных і астранамічных службаў (PAGASA). «Мангхут» класіфікуецца як супертайфун, максімальная сіла ветру складае 270 кіламетраў у гадзіну.

# МАСМЕДЫЯ ВЫБУДОЎВАЮЦЬ БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКУЮ ПЛАТФОРМУ

**У Міністэрстве інфармацыі краіны прайшла сустрэча з кіраўніцтвам Усекітайскай асацыяцыі журналістаў.**

Кітайская журналісцкая супольнасць знаходзіцца ў добрых адносінах з калегамі з Беларусі. Гэта відаць і па стасунках розных масмедыя Кітая і Беларусі, і па кантактах Усекітайскай асацыяцыі журналістаў з Беларускім саюзам журналістаў. Пра гэта ішла размова і на сустрэчы з кіраўніцтвам згаданай асацыяцыі ў Міністэрстве інфармацыі Беларусі. Сярод удзельнікаў быў і першы намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў Сяргей Сверкуноў.

«Мы лічым, што наспела неабходнасць выбудаваць агульную платформу для абмену інфармацыяй паміж нашымі краінамі, — заўважыў на сустрэчы выканаўчы дырэктар Усекітайскай асацыяцыі журналістаў Чжан Байсінь. — Гэтаму магло б паспрыяць і стварэнне супольнай грамадскай арганізацыі, якая аб'яднала б журналістаў з розных краін».

Размова на сустрэчы ішла і пра вопыт работы кітайскіх масмедыя ў інтэрнэце, сацыяльных сетках. Кітайскія калегі запрасілі беларускі бок да ўдзелу ў семінарах, канферэнцыях па пытаннях журналісцкай адукацыі і практыкі ў КНР. А таксама выказалі спадзяванне на наладжванне трывалых адносін з ВНУ Беларусі, якія займаюцца падрыхтоўкай журналісцкіх прафесійных кадраў. Найперш — для працы ў інтэрнэт-медыя.

**Сяргей ШЫЧКО.**

## ■ «Я зноў выбіраю «Звязду»

### «Матэрыялы кранаюць за душу»



**Вольга СІДАРЧУК, намеснік начальніка ўпраўлення распаўсюджванне друкаваных СМІ РУП «Белпошта»:**

— Свежы нумар «Звязды» я заўсёды разгортваю з вялікім задавальненнем і цікавасцю. Не толькі з-за таго, што ў газеце можна знайсці шмат пазнавальнай, практычнай інфармацыі аб грамадска-палітычным жыцці краіны.

На высокім узроўні асвятляюцца культурныя і спартыўныя падзеі. Але самае галоўнае — тое, што газета выдаецца на роднай беларускай мове. Асабіста мне вельмі падабаюцца матэрыялы, падрыхтаваныя Валянцінай Доўнар. Яны літаральна кранаюць за душу ■

# БЕЛАРУСЬ СЁННЯ ДАЛУЧЫЦЦА ДА ГЛАБАЛЬНАГА ДНЯ ПРЫБОРКІ

**Сёння, 15 верасня, адбудзецца акцыя міжнароднага руху Let's do it! — Глабальны дзень прыборкі. Па задумцы арганізатараў, у гэты дзень удзельнікі і ўдзельніцы руху са 150 краін правядуць прыборку несанкцыянаваных звалак. Беларусь таксама далучаецца да акцыі.**




Пачынаючы з 21 красавіка валанцёры руху «Зробім!» актыўна шукалі навалы смецця ў лясах, на берагах рэк і азёр, месцах масавага адпачынку і наносілі іх на карту. У працэсе фарміравалі каманды і наладжвалі сувязі з мясцовымі органамі ўлады. Сёння гэтае смецце будзе прыбранае.

— Мы спадзяёмся, што 15 верасня на прыборку выйдзе максімальная колькасць добраахвотнікаў па ўсёй Беларусі, — кажуць у арганізацыйным камітэце руху па прыборцы несанкцыянаваных звалак «Зробім!». — Пры гэтым важна не толькі зрабіць прыроду чысцейшай, але і падзякаваць адно аднаму за добрую справу.

Прыборка пройдзе ў Мінску, Гомелі, Гродне, Брэсце, Вілейцы, Баранавічах, Рэчыцы, Маладзечне, Ракаве, Оршы, Слуцку, Пінску, Мядзеле, аграгарадках Нарач і Прылукі, вёсках Полцева і Лескавічы Шумілінскага раёна.

У Мінску 15 верасня валанцёрская прыборка пройдзе ў парку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. На працягу двух гадзін удзельнікі будуць наводзіць парадак у лесапаркавай зоне. Пасля арганізатары запрасяць добраахвотнікаў на невялікі пікнік.

Для тых, хто хоча правесці Глабальны дзень прыборкі асабліва актыўна і з карысцю, кампанія «Гарадскі Ляснічы» падрыхтавала новы пешы марафон, які пройдзе праз «Райскі сад» і самую доўгую алею сталіцы. Па ходзе руху ўдзельнікі марафону таксама правядуць міні-акцыі па прыборцы. Таму арганізатары раяць захапіць з сабой пакеты і пальчаткі.

Незвычайную прыборку ў гэты дзень правядзе жыхар Мінска амерыканкага паходжання Джон Росмен, які запрашае ўсіх аматараў велатранспарту і загарадных паездак адправіцца ў лес каля мікрараёна Уручча. Старт ад Нацыянальнай бібліятэкі ў 13.00.

Акцыі па прыборцы праводзяцца пры падтрымцы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

**Святлана БУСЬКО.**

## ■ Тэлесеткі

### У НАРОД ПА ТАЛЕНТЫ

**Маштабны дзіцячы тэлепраект «Талент краіны» трэці раз рыхтуецца да выхаду ў эфір, а напярэдадні праводзіць дадатковы набор удзельнікаў. Трапіць у апошні вагон конкурсу змогуць таленавітыя дзеці ва ўзросце 5—15 гадоў і калектывы (да 3 чалавек), якія займаюцца харэаграфіяй і выступаюць у арыгінальным жанры.**

Як расказалі «Звяздзе» на тэлеканале АНТ, які выступае адным з заснавальнікаў конкурсу, кастынг праходзіць у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. 15 верасня адборачнае журы прагледзіць прэтэндэнтаў у намінацыі «Харэаграфія» (народная, класічная або сучасная), 16 верасня ў гэты ж час змогуць паказаць сябе прадстаўнікі арыгінальнага жанру («Акцёрскае майстэрства», «Мастацкая дэкламацыя», «Цыркавое мастацтва»). «Калі вы робіце нумар пад музыку, не забудзьцеся прыхапіць з сабой флэшку з патрэбнай музычнай кампазіцыяй», — нагадваюць арганізатары. Перавагу ў адборы будуць мець лаўрэаты і прызёры міжнародных конкурсаў, аднак на вялікім рахунку шанц гучна заявіць пра сябе гэтай восенню атрымае абсалютна кожны прэтэндэнт.

**Вікторыя ЗАХАРАВА** ■

## ■ На слыху

# Схованка зброі ў цэнтры Брагіна

**Пра знаходку стала вядома ад дырэктара дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы. Рабочыя на будаўнічым аб'екце займаліся ўладкаваннем тратуарных дарожак. У нейкі момант коўш экскаватара зачапіўся за металічныя прадметы. Як аказалася, гэта была зброя. Тэрыторыю ДЮСШ і найбліжэйшых раёнаў ачапілі, рабочых аддалілі на бяспечную адлегласць. Да раскопак знойдзенага прыступілі спецыялісты групы размініравання. Яшчэ на этапе праверкі тэрыторыі пасля прыезду яны былі здзіўлены: мінашукальнікі паказвалі неверагодную колькасць зброі.**

Па інфармацыі УУС Гомельскага аблвыканкама, усяго на гэтым месцы было знойдзена 255 ствалоў. На паверхню дасталі ржавыя часткі 12 кулямётаў Дзегцярова, 39 ППШ, 36 вінтовак Мосіна, 6 станковых і 2 авіяцыйныя кулямёты «Максім» і некалькі станін да яго, процітанкавую стрэльбу і дзве ствольныя каробкі з ударна-спускавым механізмам да яе. Таксама было знойдзена 65 карабінаў Мосіна 1944 года выпуску, 23 нямецкія карабіны К-98 «Маўзер», пяхотны кулямёт Дзегцярова, дэталі і трое санак да яго. Ідэнтыфікаваныя аўтамат Фёдарава, самазарадныя вінтоўкі Сіманава і Токарава, мінамётная станіна да мінамёта. Выяўлена таксама вялікая колькасць ствольных каробак, газавых поршняў, ударна-спускавых механізмаў.




Пасля высветлілася, што небяспекі зброя не ўяўляла. Папярэдні агляд паказаў, што яна не зараджана. Не было ў схованцы і боепрыпасаў. Праводзіцца праверка, прызначаны неабходныя экспертныя даследаванні. Ва УУС пакуль не могуць сказаць, адкуль узялася схованка. Мяркуецца, што гэта магла быць канфіскаваная пасля вайны ў насельніцтва зброя. Не выключана, што склад быў створаны ў канцы вайны, калі меркаваць па вінтоўках 1944 года выпуску. Вядома, што раней на гэтым месцы знаходзіўся будынак ваенкамата, які ў савецкі час знесли.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

# ЖАНЧЫНА ПАМЕРЛА ПАСЛЯ ЎКУСУ ВОС

## Зараз — пік выклікаў па ліквідацыі гнёздаў джалячых насякомых

**Няшчасны выпадак адбыўся раніцай на адной з дач у Слуцкім раёне. Па папярэдніх звестках УСК па Мінскай вобласці, пасля ўкусу вос жанчыне стала дрэнна. Яе муж выклікаў хуткую. Аднак, нягледзячы на рэанімацыйныя мерапрыемствы, жанчына памерла. Дакладную прычыну смерці дапаможа ўстанавіць судова-медыцынская экспертыза.**



А літаральна на наступны дзень тры асіныя гнязды выдалілі ратавальнікі ў Мінску. Выклікі паступілі з дзіцячых садкоў у Ленінскім і Фрунзенскім раёнах, а таксама з 25-й гарадской дзіцячай паліклінікі. У адным дзіцячым садзе восы аблюбавалі месца пад дахам, у другім — пад аконнай рамай. У паліклініцы непрошаных гасцей выявілі ў шчыліне будынка. Усе гнёзды былі ліквідаваныя.

Як нагадалі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, пік выклікаў па выдаленні гнёздаў пчол, вос або шэршняў традыцыйна прыпадае на жнівень — верасень. Сям'я насякомых дасягае максімальнага памеру да канца лета — у гэты час яны найбольш актыўныя.

Ратавальнікі бясплатна прыбіраюць гнёзды насякомых у дзіцячых садках, дамах састарэлых і інвалідаў, бальніцах і іншых сацыяльных установах. Калі гняздо знойдзена ў доме, то жыхарам варта звярнуцца ў таварыства ўласнікаў або ЖРЭА. Ратавальнікі ў такіх выпадках аказваюць паслугі на платнай аснове. Аднак у надзвычайных сітуацыях, калі, напрыклад, хтосьці разварушыў гняздо або ў кватэры ці доме знаходзяцца дзеці, а бацькі не могуць да іх трапіць з-за насякомых, работнікі МНС выязджаюць неадкладна.

Спецыялісты расказалі, як можна застрахавацца ад з'яўлення непрыемных суседзяў. Як правіла, восы, пчолы і шэршні выбіраюць для гнёздаў дуплы ў дрэвах, гарышчы, надворныя пабудовы. МНС рэкамендуе яшчэ да наступлення лета заладзіць шчыліны на гарышчы, праз якія насякомыя могуць трапіць пад дах дома. Правяраць трэба таксама падвалы, нішы, у тым ліку схаваныя, а таксама засценкі паміж дамамі — іх можна запоўніць мантажнай пенай або будматэрыяламі. У горадзе пільную ўвагу варта ўдзяляць балконам і месцам пад дахам. Невялікае, памерам з яблык, гняздо можна зняць самастойна пры дапамозе мяшка і рыдлёўкі, а затым спаліць ці закапаць. Пры гэтым у МНС раяць паклапаціцца пра бяспечнасць твару і рук, дачакацца вечара, калі ўсе насякомыя вяртаюцца ў сваё жыллё і іх актыўнасць зніжаецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Чарговыя «ахвяры» лесу

**За суткі ратавальнікі тройчы выязджалі на пошукі жанчын, якія заблудзілі ў лясах, паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.**

Так, днём паступіла паведамленне пра неабходнасць аказання дапамогі ў пошуку жанчыны, што згубілася ў лесе каля вёскі Дручаны Бялыніцкага раёна. Пенсіянерка 1946 года нараджэння пайшла па ягады суткамі раней і не магла выйсці з лесу самастойна. У 16.20 жанчына была знойдзена ратавальнікамі, яна не пацярпела.

У шэсць гадзін вечара работнікам МНС патэлефанавала іншая жанчына, якая таксама згубілася. Высветлілася, што пры зборы ягад яна заблудзіла і захрасла ў балоце каля вёскі Верхні Церабяжоў Столінскага раёна. На пошукі выехалі ратавальнікі, супрацоўнікі РАУС і вайскоўцы пагранічнай заставы. Каля 23 гадзін жанчына была знойдзена трывожнай групай пагранічнікаў. Медыцынская дапамога ёй не спатрэбілася.

У 21.40 ратавальнікі атрымалі паведамленне ад жанчыны 1972 года нараджэння, якая ў 18.00 пайшла па ягады і заблудзіла ў лясным масіве каля вёскі Раз'езд Фалічы Старадарожскага раёна. У 22.30 работнікі МНС знайшлі зніклую жанчыну, яна не пацярпела.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КОСМАС ВЫБІРАЕ МЭТАНАКІРАВАНЫХ

## Праўда і міфы пра «Салют-7»

По традыцыі адзін дзень падчас правядзення кангрэса адводзіцца для сустрэч касманаўтаў і астранаўтаў з грамадскасцю — навукоўцамі, даследчыкамі, канструктарамі, спецыялістамі прадпрыемстваў, якія задзейнічаны ў касмічных распрацоўках, ну і абавязкова са школьнікамі і студэнтамі, якія ўсё радзей мараць пра космас. Мы наведалі дзве такія сустрэчы.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце на шасці факультэтах і ў Інстытуце прыкладных фізічных праблем высадзіўся бадай што самы шматлікі і прадстаўнічы касмічны дэсант з дванаццаці касманаўтаў і астранаўтаў з Расіі, Швецыі, Германіі і ЗША. Выступленні гасцей былі напрамую звязаны са спецыфікай адукацыйнай і навуковай дзейнасці тых падраздзяленняў, куды яны завіталі. Напрыклад, геаграфічны факультэт наведалі **Марыё РАНКА, амерыканскі астранаўт, спецыяліст у галіне мэтэаралогіі і фізічнай акеанаграфіі, і касманаўт Віктар САВІНЫХ, двойчы Герой Савецкага Саюза, вучоны,** які шмат гадоў быў рэктарам Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта геадэзіі і картаграфіі, а цяпер займае ў гэтай ВНУ ганаровую пасаду прэзідэнта.



Расійскі касманаўт Юрый УСАЧОЎ не адмовіў у аўтографе ніводнаму ўдзельніку сустрэчы.



Для амерыканскага астранаўта Марыё РАНКА правялі экскурсію па Музеі землязнаўства на геаграфічным факультэце БДУ і прадэманстравалі калекцыю рэдкіх мінералаў.

Пра подзвіг Віктара Савіных моладзь ведае дзякуючы фільму «Салют-7», які выйшаў на экраны летась. У цэнтры сюжэта — выратаванне савецкай касмічнай станцыі, якая страціла сувязь з Зямлёй, перастала рэагаваць на ўсе каманды з Цэнтра кіравання палётамі. Раней ці пазней яна пачала б зніжацца і ў рэшце рэшт упала б на Зямлю. Да таго ж і губляць дарагую касмічную тэхніку ніхто не хацеў... Таму перад экіпажам у складзе Уладзіміра Джанібекава і Віктара Савіных была пастаўлена задача: прыстыкавацца ўручную да некіраванага «Салюта-7» і вярнуць касмічную станцыю да жыцця. Іх палёт стаў адной з самых складаных місій у гісторыі сусветнай касманаўтыкі.

Станцыя круцілася ў космасе ва ўсіх плоскасцях на вялікай хуткасці. Стыкоўку ў такіх умовах яшчэ ніхто і ніколі не выконваў. Было невядома, што здарылася на станцыі: выбух, разгерметызацыя з-за падання метэарыта або, можа быць, пажар? На Зямлі адпрацоўвалі дзеянні экіпажа на ўсе выпадкі...

Натуральна, што студэнты пацікавіліся меркаваннем Віктара Савіных пра кінафільм. Ці не з'яўляецца расійская стужка адказам амерыканскаму «Амаргедону»? І як ён ставіўся да таго, што да «мёртвай» станцыі паляцеў карабель пад нумарам 13?

— Абсалютна спакойна, — запэўніў герой-касманаўт. — Гэта амерыканцы баяцца лічбы 13. Нават калі яны трэніраваліся ў нашым Зорным гарадку, то ніхто з іх у 13-м пакоі не жыў. А ў мяне з гэтай лічбай у жыцці шмат што звязана. Падчас першага майго касмічнага палёту стыкоўка праходзіла 13 сакавіка. Трэці палёт быў у рамках 13-й Міжнароднай экспедыцыі. Да «Салюта-7» мы ляцелі на караблі «Саюз Т-13». І жыву я ў кватэры № 13. Так што я сябрую з гэтай лічбай. Ніякіх забабонаў у мяне няма.

Што датычыцца праўдападобнасці фільма, то там, канешне, вельмі шмат мастацкага вымыслу. Ніхто кувалдай у адкрытым космасе не махаў! Гэты эпізод мяне больш за ўсё абурыў. А вязаныя шапкі на нас — гэта праўда. Тэмпература на станцыі, калі мы туды трапілі, была мінусавая. Але ўвогуле я лічу фільм карысным для прыцягнення ўвагі моладзі да космасу. Касмічныя палёты заўсёды напоўнены самымі рознымі нештатнымі сітуацыямі, на якія трэба рэагаваць імгненна. І важна паказаць граматныя дзеянні экіпажа.

## Ці бачная зверху Вялікая кітайская сцяна?

Амерыканскі астранаўт Марыё Ранка здзейсніў тры касмічныя вандроўкі на шатлах і адзін выхад у адкрыты космас. Ён служыў афіцэрам мэтэаслужбы на дэсантным караблі, афіцэрам экалагічнай службы ВМС ЗША, праводзіў акіянаграфічныя і гідраграфічныя даследаванні. Запрашэнне паступіць у NASA атрымаў у 1987 годзе. І хоць годам раней трагічна загінулі сем членаў шатла «Чэлэнджэр», яго гэта не спыніла...

— Калі я рос, наша краіна была ахоплена інтарэсам да космасу, — канстатуе ён. — Я глядзеў фантастычныя фільмы кшталту «Стартрэка» і таксама марыў пра космас. Вельмі хацелася б, каб так было і цяпер. У мяне часта пытаюцца, што я думаю пра сучасныя фантастычныя фільмы. Скажу, што самы горшы фільм, які я глядзеў, — гэта «Гравітацыя».

У Марыё выдатнае пачуццё гумару. На пытанне: «А што, акрамя добрага здароўя, патрабуецца для таго, каб трапіць у космас?» ён упэўнена адказвае: «Трэба быць такім жа прыгожым, як я». А ці ёсць месца гумару на касмічным караблі? «Там мы пастаянна жартуем адзін з аднаго, — сцвярджае ён. — Гумар — выдатны спосаб разрадзіць атмасферу і ўстанавіць больш цесныя сувязі з калегамі, з якімі ты праводзіш побач шмат часу».

Усіх цікавіць, як спіцца ў космасе і што сняцца касманаўтам.

— Некаторым падабаецца спаць у бязважкасці, але толькі не мне, — кажа Марыё. — Першы раз я адправіўся ў космас у 39-гадовым узросце. Гэта значыць, што 39 гадоў я спаў у сваім ложку з падушкай і коўдрай. Прызнаюся, што іх у космасе вельмі не хапала. Да таго ж, калі ты знаходзішся ў бязважкасці і на цябе не дзейнічае прыцягненне, твой пазваночнік выцягваецца: я, такім чынам, вырас на два сантыметры. Падобнае «падаўжэнне» стала прычынай болю ў паясніцы. Прыйшлося прымаць абязбольвальныя сродкі, каб заснуць. Калі вас на Зямлі штосьці непакоіць (прастуда ці насмарк), вы ж таксама не можаце заснуць. Затое добрая навіна заключалася ў тым, што раней, калі ў мяне пыталіся пра мой рост, я людзям крышачку хлусіў — казаў, што шэсць футаў. А калі я ў космасе «падрос», выйшла, што казаў усім праўду...

Калі ты знаходзішся на арбіце, то спіш менш, бо графік вельмі насычаны. Тым больш калі хочаш правесці нейкі час каля ілюмінатара і паназіраць за Зямлёй, зорамі, зрабіць фотаздымкі, то даводзіцца скарачаць пад свае патрэбы час на сон. Але адзін свой сон падчас касмічнай экспедыцыі Марыё ўсё ж такі запомніў і падзяліўся ім з аўдыторыяй: яму снілася, што яны разам з жонкай знаходзяцца ў кабіне шатла. Паміж імі стаіць свечка, але запальваць яе катэгарычна нельга, і яны разам назіраюць у цемры за космасам.

Метэоры Марыё параўноўвае з адбіткамі пальцаў у чалавека, бо яны нясуць унікальную касмічную інфармацыю. Але непасрэдна для караблёў і станцыі ўяўляюць пагрозу, таму лепш за імі назіраць на вялікай адлегласці. Астранаўт расказаў, што, знаходзячыся ў космасе, можна на працягу сутак сустракаць світанак 16 разоў. Зверху можна разглядзець мяжу паміж ЗША і Мексікай, Егіптам і Ізраілем, а вось Вялікую кітайскую сцяну — вельмі праблематычна, таму што яна па колеры зліваецца з мясцовасцю, частка сцяны праходзіць увогуле праз лясы, а ўмовы надвор'я, якія там складваюцца, таксама не спрыяюць, каб можна было яе разглядзець.

Што датычыцца выхаду ў адкрыты космас, то гэта, падкрэслівае Марыё, самыя моцныя ўражанні і захапляльны досвед у жыцці. Чалавеку насамрэч вельмі цяжка асэнсаваць бясконцасць.

## З кандытарскай фабрыкі — у космас

А вось расійскаму касманаўту Юрыю Усачову падчас адной са сваіх місій давялося выходзіць у космас аж шэсць разоў! **Герой Расійскай Федэрацыі, лётчык-касманаўт Юрый УСАЧОЎ і першы астранаўт з Вялікабрытаніі — доктар Хелен ШАРМЭН** — сустрэліся са школьнікамі ў сталічным кінатэатры «Піянер», дзе ім давялося адказваць на зусім недзіцячыя пытанні. Напрыклад, наконт перспектыў развіцця новых сродкаў для скарачэння часу пералёту да Марса.

— Выхад у адкрыты космас — гэта сур'ёзная фізічная нагрузка, таму што скафандр важыць больш як 100 кілаграм, ён нязручны і ты цягаеш яго на сабе, як слімак — сваю ракавіну. Рукі, ногі цяжка згінаюцца. Ну і псіхалагічна даводзіцца няпроста, бо трэба пастаянна кантраляваць свае перамяшчэнні. Але страху няма, пра трос, які злучае цябе са станцыяй, у гэты момант не думаеш. Усе твае рухі і сэпкі адпрацоўваюцца да аўтаматызму яшчэ на Зямлі падчас доўгіх трэніровак. Пасля выхаду ў адкрыты космас звычайна губляеш два-тры кілаграмы. Затое потым вельмі добра спіцца, таму што ты вельмі стаміўся і думаеш толькі аб адным — як добраца да сваёй падушкі, — усміхаецца Юрый Усачоў. — А вось сны ў космасе сняцца толькі зямныя.



Віктар САВІНЫХ: «Было невядома, што здарылася на станцыі: выбух, разгерметызацыя з-за падання метэарыта або, можа быць, пажар?»

Дзяцей цікавіла, што было самым складаным падчас палёту і ці бывае касманаўтам страшна?

— Старт ракеты і вяртанне на зямлю — самыя небяспечныя ў тэхнічным плане моманты палёту. А ў чалавечым... ты пазбаўлены на доўгі час звыклай атмасферы, сям'і, прыроды, змен часоў года і вялікай колькасці вады, бо экспедыцыя доўжыцца шэсць месяцаў. Для гігіенічных працэдур на касмічнай станцыі прадугледжаны свае прыстасаванні. Бульбачку таксама нельга пасмажыць на патэльні, — жартуе Юрый.

— Страшна, калі наперадзе цябе чакае невядомасць, а нас рыхтавалі да палёту прафесіяналы, і я ведала ўсё, што мне трэба было ведаць, і давярала людзям, якія стварылі карабель, — канстатуе Хелен. — На жаль, мая місія была вельмі кароткай — усяго восем дзён. Я адправілася на касмічную станцыю як даследчык. І самым складаным для мяне было зрабіць усё, што я хацела б зрабіць у космасе, канешне, акрамя пастаўленых перад мной задач. А пры падрыхтоўцы да палёту самым цяжкім было вывучыць рускую мову.

Сказаць, што Хелен выцягнула шчаслівы білет, калі трапіла ў космас, — нічога не сказаць. Яна стала першым астранаўтам у Вялікабрытаніі, хаця не была ні лётчыкам, ні канструктарам, ні інжынерам. Затое добра разбіралася ў хіміі. На момант, калі яна пачула па радыё паведамленне аб адборы кандыдатаў для ўдзелу ў касмічным палёце ў рамках праекта Juno (па збору сродкаў на фінансаванне экспедыцыі камерцыйнымі і грамадскімі арганізацыямі), Хелен працавала... хімікам-тэхнолагам на кандытарскай фабрыцы. Яна рызыкнула і перамагла сярод 13 тысяч сваіх суайчыннікаў, якія таксама імкнуліся трапіць у космас. Сёння Хелена займаецца навукай і выкладаннем. Кажа, што калі б выдаўся другі выпадак адправіцца ў космас, то яна яго дакладна не ўпусціла б...

Юрый Усачоў і Хелен Шармэн выказалі ўпэўненасць, што чалавек, які высадзіцца на Марсе, ужо нарадзіўся, больш за тое, ён ужо вучыцца ў школе. Таму ім можа стаць кожны з прысутных у зале, калі, вядома, вельмі гэтага захоча.

— Я шчыра жадаю вам не баяцца быць дзівакамі, якія мараць паляцець на Чырвоную планету, — параіў школьнікам Юрый. — Не азірайцеся на іншых, хто кажа, што гэта немагчыма. Як толькі вы пачнеце гэта рабіць, будзеце жыць чужым жыццём, а не сваім. Кожны чалавек прыходзіць у свет са сваёй задачай. Самае галоўнае — займацца любімай справай. І паверце, што ўсе намаганні каштуюць таго, каб хоць адным вокам паглядзець на Зямлю з ілюмінатара карабля, адчуць сябе ў бязважкасці...

— На свеце існуе шмат цікавых і важных прафесій. І зусім неабавязкова, каб усе імкнуліся ў космас, — дадала Хелен. — Думаю, што хопіць і некалькіх мэтанакіраваных...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Прачытаў — перадай другому

**Сумесны праект газеты «Звязда» і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**

# МІНСКІЯ СТАРОНКІ ПАДПОЛЬНАГА ДРУКУ










22 чэрвеня 1941 года была нядзеля. Але пра які выхадны можа ісці гаворка, калі на тваю краіну абрушылася страшная навала вайны? Даведаўшыся па радыё аб нападзенні Германіі на Савецкі Саюз, журналісты тэрмінова выйшлі на працу, і ўжо на наступны дзень, 23 чэрвеня, з'явіліся пазачарговыя выпускі органаў ЦК і Мінскага абкама КП(б)Б «Звязда» і «Советская Белоруссия». Выданні надрукавалі тэкст радыёзвароту намесніка старшыні Саўнаркама і наркама замежных спраў Молатава, указы ўрада аб мабілізацыі ваеннаабавязаных і ўвядзенні ваеннага становішча ў асобных мясцовасцях СССР, у тым ліку ў Беларускай ССР, а таксама патрыятычныя вершы Якуба Коласа і Пятра Глебкі — заклікі да барацьбы з ворагам.

Аднак лінія фронту рухалася вельмі хутка, і «Звязда» паспела выйсці ў Мінску яшчэ толькі адзін раз, 24 чэрвеня. Меркавалася, што выданне працягнецца ў Магілёве, але абставіны вымусілі рэдакцыю пераехаць у Гомель, дзе газета легальна выходзіла да 13 жніўня 1941 года. Пазней «Звязда» выходзіла падпольна ў Мінску і ў вёсцы Дварэц Любанскага раёна, а «Советская Беларусь» як орган ЦК і Мінскага абкама кампартыі друкавалася ў Арле, Казані, Маскве і Набавіцы.

Зрэшты, працягнуць гаворку пра падпольны беларускі друк хочацца не чарговым успамінам пра «Звязду» — падпольшчыцу і партызанку, а расказам пра іншыя газеты, якія, нягледзячы на ўсе захады нямецка-фашысцкіх акупантаў, друкаваліся і распаўсюджваліся на Міншчыне ў ваенны час.

## Слова — таксама зброя

У кнізе ўспамінаў сакратар Мінскага абкама і камандзір Мінскага партызанскага злучэння **Васіль Казлоў** адзначаў, што галоўная складанасць арганізацыі падпольнага і партызанскага друку была ў тым, што на пачатку вайны самі падпольныя партыйныя арганізацыі атрымлівалі вельмі нерэгулярную і недастатковую інфармацыю пра стан спраў на фронце і ў краіне: «Каб запоўніць гэты прабел, арганізавалі сістэматычны прыём радыёперадач з Масквы і атрыманую інфармацыю мы адразу даводзілі да шырокіх мас насельніцтва. Зводкі Саўінфармбюро, матэрыялы з газет і іншыя важныя павядамленні. Да раніцы іх перапісвалі, потым размнажалі на пішучых машынках, а раніцай адпраўлялі ў найбліжэйшыя гарады, сёлы і ў партызанскія атрады. У Мінскай вобласці выдавалася 34 падпольныя газеты, у тым ліку «Звязда» і «Чырвоная змена».

*У сталіцы выходзіла газета «Минский большевик», у Мінскім сельскім раёне — «Шлях соцыялізма», у Любанскім — «Кліч Радзімы», Бягомльскім — «Советский патриот», Барысаўскім — «Большэвіцкая трыбуна», «Большевистская правда», «Народный мститель», у Дзяржынскім раёне — «Ленинская правда», Заслаўскім — «Мы отомстим», «Партизан-комсомолец», Капыльскім — «Калгаснік Копыльшчыны», Крупскім — «Партизанский путь», Краснаслабодскім — «Чырвоная зара», Лагойскім — «За Совецкую Беларусь» і «За Совецкую Радзіму», «Котовец», Плешчаніцкім — «Ленінец», Пухавіцкім — «Партизан Белоруссии», Рудзенскім — «Бальшавіцкі сцяг», «В бой за Родину», Слуцкім — «Патриот Родины», «Народны мсцівец», Смалявіцкім — «Смерть фашизму», Старобінскім — «Советский патриот», Старадарожскім — «За Советскую Родину», Уздзенскім — «За Совецкую Радзіму», Халопеніцкім — «Красное знамя», Чэрвеньскім — «Червенский партизан»... Наклад іх быў адносна невялікі, па 500—600 асобнікаў, дый фармат таксама змяняўся: газеты выходзілі то на палове звычайнай паласы, а то і на 1/8, і, зразумела, далёка не кожны дзень. І тым не менш мінскі падпольны друк даваў магчымасць выказацца партызанам і сялянам, кіраўнікам падпольнага руху і тым, хто перайшоў на бок Савецкай Арміі, стаўшы яшчэ адной — інфармацыйнай — зброяй у барацьбе з ворагам.*

Вось як апісаў рэдактар газеты **«Минский большевик» Аляксандр Сакевіч** восенню 1943-га расправу гітлераўцаў над мінчанамі пасля выбуху ў сталоўцы СД і замаху на гаўляйтара Кубэ: «В сентябре месяце в Минске, в районе Комаровки, гитлеровские изверги окружили несколько улиц. Всех мирных жителей в количестве свыше 1000 человек... палачи грузили на автомашины и отправляли в район Тростенец. На месте кровавой расправы были приготовлены две большие ямы. Одна за одной подходили машины. Сталкивая перепуганных стариков, женщин и детей, немецкие бандиты расстреливали их в упор и бросали в ямы. Эти двуногие звери, потерявшие человеческий облик и всякие чувства морали, с цинизмом опубликовали сообщение о том, что ими расстреляно 300 человек врагов немецкой власти».

«Не проходит дня, чтобы народные мстители-минчане не напоминали о себе немцам, проявляя при этом исключительное мужество и самоотверженность. Минчанам хорошо известны имена героев Евгения и Кирилла Гурло, Оли Волчёк, пламенного агитатора Лаврентия и многих других погибших на боевом посту от рук немецких палачей», — працягвае выданне хроніку барацьбы. І заклікае чытачоў практычна ў кожным нумары: «Умножим удары по врагу, приблизим день нашего освобождения!», «Смерть фашистским сообщникам!», «Молодежь, беспощадно уничтожай немцев!». Усяго ж да ліпеня 1944 года, як сведчаць архівы, выйшла ў свет 25 нумароў выдання.

У студзені — жніўні 1942 года падпольная група А. Маркевіча выдавала малафарматную газету «Патрыёт Радзімы» — на жаль, да маштабнай аблавы на мінскае падполле яна паспела выйсці ўсяго восем разоў.

У снежні 1942 года на востраве ў Загальскіх балотах размясцілася падпольная друкарня, якая выдавала спачатку лістоўкі, а потым і слуцкую падпольную газету **«Народны мсцівец»** — на ўласнаручна зробленых друкарскіх касе і станку і з дапамогай шрыфту, які партызанам удалося забраць з нямецка-фашысцкай друкарні ў Любані. «Па пояс у балотнай вадзе мы прабіраліся з вострава на востраў, — успамінаў пазней рэдактар «Народнага мсціўца» **Мікалай Дастанка.** — У адным месцы фашысты нас моцна «зажучылі», як гаварылі мы пасля, жартуючы, і становішча было пагражаючае. З плячэй знялі сухары, але пакінулі шрыфт — сем дзён у балоце ў нас не было крошкі хлеба, але за плячыма быў шрыфт...» Толькі ў сакавіку з Масквы прывезлі для падпольнай друкарні партатыўную машынку. Газета выходзіла кожны тыдзень з заклікамі «Шырэй раздуць полымя партызанскай барацьбы ў тылу ворага!», «Мы не будзем рабамі», «За абрабаваную, разбураную, спаленую Случчыну — знішчай фашысцкую погань!», «Усе сілы і сродкі на разгром ворага!», «Хлеб — нам, а немцам — кулю!». Чорную хроніку рэгулярна папаўнялі назвы разбураных і спаленых разам з жыхарамі вёсак: Вісея, Кублішча, Адамова, Палікараўка, Беразінец, Жылін Брод, Панічы, Амговічы, спісы масава закатаваных людзей.

Шмат пісаў **«Народны мсцівец»** і пра намеры акупантаў стварыць прафашысцкія арганізацыі, у тым ліку «Беларускую краёвую абарону» і «Саюз беларускай моладзі», заклікаў не верыць абяцанням ворагаў і востра каментаваў гітлераўскую прапаганду: «Фашысты выпускаюць газету-анучу «Газета Случчыны», старонкі якой запоўнены атрутай хлусні аб жыцці савецкай краіны, рознай чапухой і граззю... Фашысцкія прыслешнікі раяць селяніну: «У Нямеччыне і ў краях новай Эўропы народы з-за нястачы коней ужо ад колькі год выкарыстоўваюць цяглавую сілу каровы. Праца павялічвае ўдойнасць і тлустасць малака. Запрагай сваю карову». Фашысцкія парады шыты белымі ніткамі. Запрэгчы б у плуг гэтага гітлераўца, хай бы ён «павялічыў тлустасць!».

«Камандзір энскага партызанскага атрада Уладзімір Т. піша: «Партызаны нашага атрада б'юць ворага не толькі зброяй, але і словам бальшавіцкай праўды. У вёсках Слуцкага раёна праведзена каля 30 гутарак і дакладаў, распаўсюджана сотні лістовак і газет. У выніку праведзенай палітмасавай работы атрад павялічыў рады на 25 прац. Працоўныя аддалі 81 075 руб. збераженняў на пабудову баявых танкаў і самалётаў».

Як падлічылі даследчыкі з факультэта журналістыкі БДУ, у тыле ворага было выпушчана 78 нумароў газеты агульным тыражом больш як 37 тысяч асобнікаў, а таксама 72 тысячы асобнікаў лістовак і адозваў.

## Зачытвалі да дзірак

Сувязныя, якія распаўсюджвалі газеты на акупаванай тэрыторыі, перачытвалі па некалькі разоў аператыўныя зводкі і іншыя матэрыялы, каб добра запомніць і пераказаць сваімі словамі змест тым сялянам, якія ўжо дрэнна бачылі ці з іншых прычын не маглі самі прачытаць газету. Часта разносілі газеты і лістоўкі па вёсках самі літсупрацоўнікі, наборшчыкі і друкары і бачылі жывую рэакцыю на кожны матэрыял: радасць і надзею — ад навін пра перамогі Чырвонай Арміі, гнеў і нянавісць — ад пераказу зверстваў фашыстаў, з'едлівы смех — ад «куткоў гумару і сатыры». Так, не адзін дзясятак чалавек рагатаў, перачытваючы анекдот-замалёўку ў барысаўскай **«Большэвіцкай трыбуне»** за 29 жніўня 1943 года:

— Унучак, дзе ты тады быў, як гарэў нямецкі склад? Трэба было сыйсці з воч немцаў, каб напрасна не прычапіліся праклятыя.

— Не, бабулька, я тады зусім не быў у іх на вачах, я ў той час другі склад падпальваў.

У Пухавічах падпольны райкам партыі выдаваў газету **«Партизан Белоруссии»**, якая паслядоўна і падрабязна інфармавала насельніцтва пра становішча на франтах, пра дзейнасць мясцовых партызанскіх злучэнняў. Так, 2 кастрычніка 1943 года выданне адзначыла другую гадавіну партызанскага злучэння «Полымя»: «Ими пущено под откос 59 эшелонов противника, уничтожено и повреждено 52 паровоза, 841 вагон, 86 автомашин, взорвано 6 железнодорожных и сожжено 13 шоссейных мостов, взорвано более 1600 рельсов. 2551 фашистский разбойник погиб собачьей смертью от партизанских пуль соединения «Пламя».

Былы адказны сакратар падпольнай лагойскай газеты **«За Совецкую Беларусь» Барыс Сасноўскі** згадваў, што ў 1942 годзе лістоўку, у якой расказвалася пра перамогу савецкіх войскаў пад Сталінградам і знішчэнне 330-тысячнай арміі праціўніка, чыталі і перачытвалі, перадаючы з рук у рукі, тысячы людзей: «Яна дайшла ў кожную вёску і нават у Мінск, Барысаў, Вілейку. Намер гітлераўцаў утаіць ад савецкіх людзей паражэнне на фронце не ўдаўся. А яшчэ праз тыдзень жыхары нашага раёна ўжо чыталі першы нумар сваёй «раёнкі», якая выйшла ў падполлі...» Таксама ў лагойскай друкарні ўбачылі свет першыя нумары газет «Ленінец» (Плешчаніцкі райкам), «Партызанская праўда» (Ільянскі райкам) і «Котовец» (выданне партызанскага атрада імя Катоўскага). Лясныя рэдакцыя і друкарня, па ўспамінах іх супрацоўнікаў, дзейнічалі круглыя суткі, а тыраж аднаго выдання дасягаў 500 і нават 1000 асобнікаў.

## Кропкі не пастаўлены

«Мультымедыйнае выданне «Падпольны і партызанскі друк Беларусі», якое змяшчае навуковыя артыкулы і лічбавыя копіі дзясяткаў падпольных і партызанскіх газет, насценгазет, улётак, адозваў, плакатаў, рукапісных выданняў са збораў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнага архіва і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, убачыла свет у 2009 годзе. З таго часу ўжо двойчы перавыдавалася з дапаўненнямі, — гаворыць **загадчык аддзела рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Галіна КІРЭЕВА**, — бо з'яўляюцца ўсё новыя матэрыялы, якія раней не былі вывучаныя». Даследчыкі таксама не губляюць да тэмы інтарэс: у снежні 2017-га выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» прэзентавала каталог «Партызанскія рукапісныя часопісы Мінскай вобласці».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Торфопредприятие «Колпеница»

| Предмет торгов | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка |
|---|---|---|
| Лот № 1.<br>1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88819 (наименование – мехмастерская; назначение – здание специализированное иного назначения) площадью 704,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000018, площадью 1,3343 га по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, п. Кабушкина, ул. Заводская, 7.<br>2) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88811 (наименование – материальный склад; назначение – здание специализированное складов, хранилищ) площадью 143,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000018, площадью 1,3343 га по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, п. Кабушкина, ул. Заводская, 7 | 1 базовая величина (24,5 руб.) | 1 базовая величина (24,5 руб.) |
| Лот № 2.<br>1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88809 (наименование – главный корпус брикетного завода с бытовыми помещениями; назначение – здание специализированное иного назначения) площадью 1204,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000013, площадью 7,6687 га по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, 17, 0,7 км северо-восточнее п. Кабушкина.<br>2) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88801 (наименование – склад готовой продукции; назначение – здание специализированное складов, хранилищ) площадью 192,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000013, площадью 7,6687 га по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, 17/2, 0,7 км северо-восточнее п. Кабушкина.<br>3) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88820 (наименование – автовесовая; назначение – здание специализированное иного назначения), площадью 67,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000013, площадью 7,6687 га по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, 17/1, 0,7 км северо-восточнее п. Кабушкина | 382 887,73 | 38 288,77 |
| Лот № 3.<br>1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88800 (наименование – магазин; назначение – здание специализированное розничной торговли) площадью 149,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000022, площадью 0,0219 га по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, п. Кабушкина, ул. Заводская, 6 | 8 387,92 | 838,79 |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 17 октября 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 16 октября 2018 г. до 17.00**

---

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

### Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белсантехмонтаж-2», г. Минск, ул. Брилевская, 15 |

**Предмет аукциона**
**Имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Промышленный, 12, в составе**

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Навес-склад (литер В 1/кп)** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 3433 кв. м | 500/С-29825 |
| **Цех изоляции труб и открытая площадка № 1, № 2 (литер Е 1/кп)** | Здание неустановленного назначения | 1147 кв. м | 500/С-31742 |
| **Д 1/к. Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 380 кв. м | 500/С-29823 |
| **Насосная станция. Литер Ж 1/к** | Здание неустановленного назначения (составные части и принадлежности: два подземных резервуара) | 51 кв. м | 500/С-31729 |
| **Здание административно-хозяйственное** | Здание административно-хозяйственное | 4343,8 кв. м | 500/С-29809 |
| **Пост сварки** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 52,3 кв. м | 500/С-31254 |
| **Пост сварки** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 26,9 кв. м | 500/С-35219 |
| **Внутренние сети связи** | Сооружение специализированное связи | 96,7 кв. м | 500/С-1025198 |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | Сооружение специализированное коммунального хозяйства | 261,8 кв. м | 500/С-1025197 |
| **Ливневая канализационная сеть** | | 1170,7 кв. м | 500/С-1025196 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Общ. пл. 4,3698 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания административно-бытового, производственных и складских зданий и сооружений. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах объектов газораспределительной ситстемы, пл. 0,2250 га; в охранных зонах линий связи и радиофикации, пл. 0,0210 га |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **1 992 336,00 бел. руб. (снижена на 60 %)** |
| **Обременения** | Аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведения аукциона опубликовано в газете «Звязда» в номере от 08.08.2018

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **27.09.2018** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **25.09.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
## по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Организатор электронных торгов: Новопольский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Новополье, ул. Центральная, 21, тел.: 8(017) 133 03 16, 133 03 35, 133 01 39, тел. моб. 8 (029) 546 06 71

Оператор электронной торговой площадки: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»

Электронный адрес электронной торговой площадки: www.et.butb.by

Дата проведения электронных торгов: 18 октября 2018 года

Время проведения электронных торгов устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура | Начальная цена *(руб.)* | Задаток *(руб.)* | Расходы по подготовке *(руб.)* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Культура, ул. Усходняя У-2 | 624484004601000051 | 0,1488 | Подъездные пути местного значения. Свет в ближайшей перспективе.* | 3700,00 | 370,00 | 1198,07 + стоимость в СМИ и ЭТП |
| 2 | д. Подгатье, ул. Полевая | 624484006101000092 | 0,1500 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения.* | 4000,00 | 400,00 | 1439,05 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 3 | д. Осока, ул. Заречная (уч. № 1) | 624484005601000174 | 0,1500 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения.* | 3200,00 | 320,00 | 1474,24 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |

*в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте. Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». Срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в электронных торгах. Назначение платежа: внесение суммы задатка на участие в торгах. Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами – 12 октября 2018 года до 15.00.

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за земельный участок, продаваемый в частную собственность, или за право заключения договора аренды земельного участка.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола, а также заключает с ним договор аренды земельного участка – в случае проведения электронных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Крупское районное потребительское общество (продавец) проводит открытый аукцион по продаже следующих объектов недвижимого имущества:

лот № 1: **здание общежития** общей площадью 123,8 кв. м, инвентарный номер № 613/С-13995, расположенное на земельном участке с кадастровым номером № 623050100002631 (предоставлен на праве аренды) площадью **0,0382 га**, по адресу: **Минская область, г. Крупки, ул. Дзержинского, 8.**

Начальная цена – **45 000** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 4500 бел. руб.).

**Задаток перечисляется на р/с № BY48BAPB30153214700100000000** БИК BAPBBY2X в ЦБУ № 525 г. Крупки региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк» ул. Советская, 10, УНН 600093961, ОКПО 01796656.

На земельном участке имеются ограничения: водоохранная зона реки, водоема площадью 0,0382 га, охранная зона линий связи и радиофикации площадью 0,0020 га, охранная зона электрических сетей до 1000 вольт площадью 0,0022 га, охранная зона объектов газораспределительной системы площадью 0,0016 га.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Аукцион состоится 16.10.2018 в 12.00 по адресу: Минская область, г. Крупки, ул. Ленина, 7. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.10.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (801796) 54-936, 555-67.**

**Лот № 2: здание магазина ТПС № 10** общей площадью 130,0 кв. м, инвентарный номер №613/С-13998 , расположенное на земельном участке с кадастровым номером № 623050100001002629 (предоставлен на праве аренды) площадью **0,0339 га**, по адресу: **Минская область, г. Крупки, ул. Полевая, 8.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **45 000** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 4500 бел. руб.). **Задаток перечисляется на р/с №BY48BAPB30 153214700100000000** БИК BAPBBY2X в ЦБУ № 525 г. Крупки региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк» ул. Советская, 10, УНН 600093961, ОКПО 01796656.

На земельном участке имеются ограничения: охранная зона сетей и сооружений канализации площадью 0,0022 га, охранная зона линий связи и радиофикации площадью 0,0047 га.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Аукцион состоится 16.10.2018 в 12.15 по адресу: Минская область, г. Крупки, ул. Ленина, 7. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.10.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (801796) 54-936, 555-67.**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
## по продаже права заключения договора аренды земельного участка

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-46.

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот № 1. Право на заключение договора аренды сроком на 15 лет земельного участка с кадастровым № 221281903101000209, расположенного по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Задубровский с/с, аг. Задубровье, площадью 0,0929 га для строительства объекта «Строительство и эксплуатация торгового павильона в аг. Задубровье, Задубровского сельсовета, Витебского района» (назначение: земельный участок для размещения объектов розничной торговли). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Нач. цена:** 417,79 бел. руб. **Задаток:** 41,77 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: 16.10.2018 в 15.00, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи документов: с 14.09.2018 с 8.30 по 15.10.2018 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY71AKBB36003140400640000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04001 (Задубровский с/с) |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона, обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона: внести плату за право заключения договора аренды зем. участка или часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; не позднее 2 рабочих дней после выполнения указанных выше действий предоставить в Витебский районный исполнительный комитет документы, подтверждающие оплату, и заключить договор аренды земельного участка с Витебским райисполкомом; в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в установленном порядке обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию земельного участка; осуществить строительство в сроки, определенные проектной документацией.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Контактные тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

---

Утерянные представительством Белгосстраха по Слуцкому району квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) «Свидетельство по ОСАГО (внутреннее)» серии ВА № 0138580 и № 7933566 в количестве 2 шт. считать недействительными. УНП 100122726

---

Утерянную печать ООО «БЕЛМЕДДИАФАРМ», УНП 101352122, **считать недействительной.**

---

РУП «Торговый дом «Восточный» сообщает о снятии с повторного открытого аукциона, который состоится 21.09.2018 в 14.00, лота № 3: изолированное помещение с инвентарным номером 252/D-37560 общей площадью 2090,3 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Новополоцк, ул. Молодежная, 103-97, назначение – торговое помещение, наименование – магазин «Детский мир». Капитальное строение с инвентарным номером 252/С-16204, назначение – сооружение специализированное связи, наименование – линия электропередачи, протяженность – 97,2 м. Расположены на земельном участке с кадастровым номером 241800000004000013. Начальная цена продажи – 1 761 419,52 рубля, задаток – 176 141,95 рубля. Шаг аукциона – 5 %.

Извещение опубликовано в газете «Звязда» 01.09.2018 № 168.

УНП 101127633

# НАЙЛЕПШЫ Ў СВЕЦЕ КАСЦЮМ...



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У падлеткавым узросце хацелася прыгожа выглядаць. У школе я завязваў піянерскі гальштук рознымі спосабамі, імкнуўся моднічаць у нейкіх пінжаках. Але гэта быў перыяд савецкага дэфіцыту, прыгожае адзенне прадавалася толькі ў магазінах «Бярозка». Мне цікава было заходзіць і глядзець, якія там ёсць рэчы.

***— Памятаеце ваш першы асабісты досвед мадэлявання адзення?***

— У 8 класе я прыдумаў сабе куртку, а мама дапамагла яе пашыць. Нядаўна яна нават знайшлася, я вельмі смяяўся, з якіх тканін удалося яе зрабіць. У старшых класах я пашыў сабе шорты-бермуды, на белай тканіне зусім не прызначанымі для гэтага фарбамі намаляваў пальмы, астравы, нейкія замежныя словы. Рэакцыя равеснікаў — «Ваў, няўжо ты сам гэта зрабіў!» — натхніла, хацелася ісці далей.

З такога дзіцячага досведу і пачаўся шлях у прафесію. Дзеля гэтага навучыўся маляваць. Тры гады запар, дарэчы, я хадзіў на экзамены ў тэхналагічны тэхнікум — пасля 8, 9 і 10 класа. Планаваў вучыцца ў школе, а на экзамен па малюнку прыходзіў, бо цікава было праверыць свае сілы. Пасля 10 класа паступіў, і мой малюнак быў адным з лепшых. Потым вучыўся ў Акадэміі мастацтваў, на філасофскім факультэце БДУ, але не скончыў ні тое, ні другое. У нейкі момант мне станавілася сумна, і я сыходзіў. Так што я цалкам *селф-мэйд* у пэўным сэнсе гэтага слова. Веды ў розных галінах дапамагаюць разумець кліентаў з розных сфер — ад бізнесу да мастацтва. А мая прафесія — адначасова і мастацтва, і рамяство, гэтак жа, як музыка ці жывапіс.

## З ПАВАГАЙ ДА МОВЫ ДРЭС-КОДУ

***— Ці складана працаваць у грамадстве, дзе многія мужчыны праяўляюць мала цікавасці да таго, што на іх апранута?***

— У маім выпадку ўсё склалася даволі ўдала. Два дзесяцігоддзі таму, калі я пачынаў, нямногія мужчыны мелі ўяўленне пра моду, ды і менш было цікавасці да класічнага касцюма. Выключэннем былі тыя, хто зарабіў нейкі капітал, пазнаёміўся з замежнымі брэндамі. Гэта або прадпрымальнікі, або прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса. За апошнія 20 гадоў змянілася і мужчынская мода, і погляды на яе, ды і самі мужчыны. Сёння больш павагі да сябе, да свайго статусу, імкнення да камфорту і прыгажосці. З'явіліся шматлікія магчымасці зарабляць і расходаваць. Ды і свет мяняецца: людзі стаміліся ад глабальных брэндаў, ад таннага адзення. Ёсць катэгорыя людзей, якія хочуць, каб адзенне было толькі «іхнім», стварала той звыклы камфорт і прыгажосць дзякуючы якасці тканіны, правільнасці пашыву і прапорцый. Так, гэта рэдкі від мужчын, прычым усюды — як у нашым грамадстве, так і ў заходнім. Але такіх дастаткова, каб я адчуваў сябе запатрабаваным. У 20 гадоў мне было складана прадаваць класічнае адзенне для сталых мужчын. Цяпер, калі я зраўняўся ва ўзросце са сваімі кліентамі, мы размаўляем на адной мове, жывём у адным асяроддзі, у нас аднолькавыя каштоўнасці. Я добра разумею, чаго хочуць такія мужчыны.

***— Часам здаецца, што класічны касцюм саступае свае пазіцыі, бо сёння на дзелавую сустрэчу ці ў тэатр нярэдка ходзяць у джынсах...***



— Ёсць вялізнае кансерватыўнае фінансавае, палітычнае асяроддзе, якое жыве па іншых законах, дзе эстэтыка і культура адзення — гэта іншая мова. Так, сёння часта гучаць дэмакратычныя прыклады ў адзенні Стыва Джобса і Марка Цукерберга, але гэта хутчэй выключэнні з правіла. Больш за тое, у банкаўскай сферы, у высокіх фінансавых колах, пабачыўшы твой касцюм, з табой могуць адмовіцца сустракацца. І мая задача — навучыць размаўляць на мове дрэс-коду, ставіцца да яе з павагай. У прыватнасці маладых кліентаў, якія працуюць у IT-сферы і выходзяць на міжнародныя рынкі ў кансерватыўных галінах, дзе патрабуецца быць на роўных з замежнымі партнёрамі. Тут ужо байка або цішотка і джынсы не падыдуць. Дарэчы, сёння прадстаўнікі нашага бізнесу знешне вельмі добра выглядаюць на міжнародным узроўні.

***— Ці абавязкова ў мужчынскім гардэробе павінен быць класічны касцюм?***

— Я б не стаў катэгарычна сцвярджаць, што ў гардэробе кожнага мужчыны павінен быць касцюм. Магчыма, і не ў кожнага. Але трэба мець некалькі прыгожых, цікавых, адпаведных стылю жыцця пінжакоў. Гэта можа быць або касцюм, або камплект са штаноў і пінжака, якія пасуюць адзін аднаму. Мужчынскі пінжак — самы ўтылітарны прадмет гардэробу, бо яго можна насіць круглы год. У залежнасці ад абранай тканіны ён можа дарыць як цяпло, так і прахалоду. Гэта адначасова і куртка, і прадмет дзелавога гардэробу. У ім можна прыйсці як на вечарынку, так і ў месца, дзе ёсць дрэс-код. У пэўным узросце (і тут ужо скажу катэгарычна) трэба ўсведамляць, што вы пераходзіце са статусу маладога чалавека ў статус мужчыны. Але гэта ні ў якім разе не абмяжоўвае выбар адзення, і пры правільным падборы яно будзе падкрэсліваць маладосць, яркасць і энергічнасць. Пінжак, які добра сядзіць, дорыць зручнасці не менш, чым талстоўка ці байка.

Напрыклад, у Італіі мужчына, які дасягае пэўнага сацыяльнага становішча, нават пачатковага поспеху, шукае сабе краўца і далей заказвае ў яго пінжакі, касцюмы. Гэта іншы ўзровень спажывання. Ты можаш выбраць тканіну, запраграмаваць тыя ці іншыя ўласцівасці: або гэта пінжак на выхад для сур'ёзных сітуацый, або паўсядзённая рэч, якую хочацца насіць 10 гадоў і не мяняць. Пры гэтым яна будзе выдатна сядзець і ўвасабляць твой лад жыцця.

## НАВОШТА І ЯК ЧАСТА?

***— Колькі, дарэчы, можна насіць адзін касцюм? Пры тым, што кожны сезон мяняецца мода: новая форма кішэняў, каўняра...***

— Вы закранулі тэму, якая для большасці мужчын тэра інкогніта. Ёсць розныя віды тканін, адны вельмі носкія, іншыя зусім не носкія, прызначаныя, каб апранаць усяго некалькі разоў на год. Лёгкі летні пінжак з высакаякаснага тонкага кашаміру не будзе носкі. А калі ўзяць, напрыклад, шатландскі цвід вядомай маркі Harris Tweed, для вытворчасці якога выкарыстоўваецца самая грубая шэрсць, то пінжак будзе насіцца 10 гадоў і не сатрэцца. У мяне ёсць, дарэчы, такі пінжак, якому шэсць гадоў. Я двойчы мяняў падкладку, бо яна выходзіць са строю, а цвід становіцца толькі прыгажэйшы: дзесьці выціраецца, дзесьці набывае патрэбную форму.

Што датычыцца класічнага касцюма ў дзелавым гардэробе, то вельмі важна, каб мужчына дакладна разумеў, для чаго яго набывае і як часта будзе насіць. Дзіўна прапаноўваць студэнту касцюм коштам у тысячу рублёў, бо малады чалавек яшчэ зменіцца фізічна, знойдзе галіну, дзе яму будзе патрэбны іншы гардэроб. Мужчына, які робіць кар'еру, павінен усведамляць: калі ён кожны дзень апранае касцюм, то набываць варта носкі, які падыходзіць да дрэс-коду кампаніі. Любы гардэроб трэба прадумваць з пункту гледжання эканамічнасці, носкасці, камфорту, кантэкстуальнасці. Для статусных перагавораў патрабуецца раскошная тканіна, каб апанент бачыў, што перад ім чалавек высокага ўзроўню, які можа сабе дазволіць якасныя рэчы. Дарагі касцюм выдаюць і тканіна, і пашыў, і дэталі ручной работы. У мяне ёсць вопыт стварэння касцюмаў пад канкрэтныя перагаворы. І гэта працуе: людзі сапраўды дасягалі поспеху. Калі мы паглядзім на любое бізнес-асяроддзе, убачым аднолькавыя сінія касцюмы. Але на самай справе кожны з іх унікальны, бо пашыты на заказ. Там бачная і рука майстра, і стыль жыцця яго ўладальніка, уласныя перавагі і захапленні. І гэта вельмі няпроста, каб у класічным сінім касцюме была адлюстравана цэлая гісторыя чалавечага жыцця. Такога эфекту можна дасягнуць толькі з прафесійным краўцом.

***— Хто вашы пастаянныя заказчыкі?***

— Самыя розныя людзі. Але ўсе яны цэняць і паважаюць сябе, дасягнулі пэўнага поспеху і хочуць яго адчуць як праз якасць адзення, так і праз пэўны пасыл бізнес-партнёрам. Але мы адкрытыя і гатовы працаваць з усімі. Летась, напрыклад, рэалізавалі невялікі, але цікавы праект з Нацыянальным алімпійскім камітэтам. Зрабілі серыю гальштукаў для vip-персон і кіраўнікоў дэлегацый, якія наведваюць наш НАК. Гэта магчымасць паказаць, што ёсць беларускі прадукт на ўзроўні сусветных стандартаў.

***— Колькі каштуе касцюм, пашыты на заказ?***

— З улікам асаблівасцяў тэхналагічнага працэсу і кошту тканін — 1200—3000 рублёў. У Еўропе той прадукт, які мы робім, каштуе ў эквіваленце ад 3 да 10 тысяч рублёў. Для асноўнага беларускага спажыўца наша цана вельмі высокая. Але мы разлічваем не на масавага пакупніка. Наш касцюм, калі праводзіць аналогіі з аўтамабілем, прадстаўніцкага класа. Хоць я магу пашыць і для студэнта, і для прэзідэнта. У нас, дарэчы, было некалькі незвычайных заказаў, калі мы рабілі школьную форму для маладых людзей, якія вучыліся ў Англіі і Швейцарыі. Зразумела, што для школьнікаў мы выбіралі больш простыя і носкія тканіны, там не патрэбны петлі ручной работы. Калі ведаеш тэхналогію, можна гэта рэгуляваць. Тэхналогія на той жа фабрыцы «Камінтэрн» нядрэнная, проста яна іншая — накіраваная на тое, каб зрабіць масавы недарагі прадукт. Але ёсць абмежаванні: там не будзе глянцу, што ёсць у нашым касцюме. Гэта розныя полюсы адной індустрыі. У той жа Італіі падчас стажыроўкі я пабываў на пяці розных вытворчасцях: ад маленькай камернай, дзе ў неапальскім дворыку працуе адзін дзядуля і ў яго толькі прас і швейная машынка, да фабрыкі з магутнасцю тысяча адзінак у месяц і самым сучасным абсталяваннем. Тут кожны працуе ў сваім сегменце і ў кожнага свая задача.

**«У пэўным узросце (і тут ужо скажу катэгарычна) трэба ўсведамляць, што вы пераходзіце са статусу маладога чалавека ў статус мужчыны. Але гэта ні ў якім разе не абмяжоўвае выбар адзення».**



***— Колькі займае работа над адным касцюмам?***

— Ад 50 да 90 рабочых гадзін. Над касцюмам, акрамя мяне, працуюць тры спецыялісты. Мая задача — выбраць тканіну, гузікі, ніткі, аксесуары, падабраць канструкцыю, прайсціся па ўсіх тонкасцях тэхналагічнага працэсу, зрабіць прымеркі — першую, другую, трэцюю, — пакуль у кліента не загарацца вочы. Але магу зрабіць касцюм цалкам уласнымі рукамі, без швейнай машынкі, і гэта будзе лепшы касцюм у свеце. Праўда, эканамічна гэта неапраўдана.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

■ У закрытай прасторы

## Мастацкая выстаўка ў Мінску сабрала артэфакты з усяго свету

# ВАВІЛОНСКА-МІНСКАЯ ВЕЖА



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Гэта пэўны феномен: палотны на персанальнай выстаўцы Віктара Альшэўскага «Кропка адліку», якая 7 верасня адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі, быццам кампілююць культурныя здабыткі розных краін і пры гэтым уяўляюць сабой унікальныя творы мастацтва. У экспазіцыю ўключаны праекты «Фрагменты Вавілонскай вежы» і «Музеі свету», а таксама «Мой Мінск» і «Партрэт сучасніка». Усё гэта прымеркавана да 65-гадовага юбілею Віктара Альшэўскага і з'яўляецца творчай справаздачай аўтара.**

Прафесар, лаўрэат дзяржаўнай прэміі Беларусі, сузаснавальнік Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, чалавек, які прасоўвае беларускую культуру за мяжой, мастак з мажорнымі вусамі прыйшоў на адкрыццё экспазіцыі не адзін. Да яго свята далучыліся Міхаіл Мясніковіч, Лідзія Ярмошына, Павел Латушка і іншыя, мерапрыемства сабрала цэлы шэраг інстытуцый-сяброў накшталт Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Міністэрства замежных спраў, Міністэрства культуры, Мінгарвыканкама, пасольства Беларусі ў Францыі. Прыемна паглядзець, як мастацкая выстаўка выклікае цікавасць з боку афіцыйных структур. «Яны такія ж людзі, як і мы», — адказвае Віктар Альшэўскі на пытанне, ці сябруе ён з прадстаўнікамі палітычнай эліты.

Так ці інакш, праекты з рознымі канцэпцыямі дзеляць прастору Нацыянальнага мастацкага, і, напэўна, самым маштабным з іх з'яўляюцца «Фрагменты Вавілонскай вежы». Яны пачалі стварацца ў 2003 годзе і ўжо ў 2010-м, калі былі выстаўлены ўпершыню, складаліся з трынаццаці палотнаў. Сёння ў праекце ўжо пяцьдзясят дзве структурныя часткі, таму не дзіўна, што на сцяне ў Нацыянальным мастацкім Вавілонская вежа Альшэўскага проста не змясцілася. У выніку на выстаўцы «Кропка адліку» можна знайсці адразу некалькі веж ці іх граняў, што змяшчаюць у сабе культурныя здабыткі з розных краін, сярод якіх ёсць пачэснае месца і для беларускіх артэфактаў. І па словах арганізатараў выстаўкі, пэўны шыфр, для разгадкі якога наведвальніку спатрэбіцца некалькі гадзін.

**У музейную прастору, якая дыхае класічнымі формамі і старажытнымі помнікамі культуры, упісаны нашы сучаснікі з сучаснымі атрыбутамі.**

«Выява Мірскага замка і той факт, што праект створаны на нашай зямлі, ужо робяць «Фрагменты Вавілонскай вежы» вялікай Мінскай вежай, — кажа Віктар Альшэўскі. — Беларусь так ці інакш з'яўляецца зыходным пунктам, праз яе праходзяць усе духоўныя ніткі. Мы павінны больш глыбока асэнсаваць сваё месца ў Сусвеце».

Пошук месца нашай культуры ў сусветнай выглядае адной з асноўных задач выстаўкі, прынамсі, аналагічныя пытанні выклікаюць «Музеі свету», дзеля якіх аўтар пабываў «ад узбярэжжа Ціхага акіяна да Цэйлона, у афрыканскіх краінах і Еўропе». У музейную прастору, якая дыхае класічнымі формамі і старажытнымі помнікамі культуры, упісаны нашы сучаснікі з сучаснымі атрыбутамі, што выклікае пэўны кантраст і па колерах, і па сэнсах. У цэлым гэта ініцыюе нейкі эфект 3D, таму што прастора Нацыянальнага мастацкага музея — таксама класічная, і палотны з калонамі і пілястрамі сярод рэальных калон ствараюць люстэрка ў люстэрку.

«Музеі свету» — гэта своеасаблівыя «Фрагменты Вавілонскай вежы», — кажа Віктар Альшэўскі. — Я спрабую асэнсаваць прастору сабраных у сховішчах артэфактаў. Музей — гэта адбітак цывілізацыі на зямлі, у той жа час практычна кожны дзень мы бачым, як адны ствараюць, а другія разбураюць. А Беларусь (і Мінск) з'яўляецца зыходным пунктам і часткай вялікай цывілізацыі, толькі раней мы ўвесь час былі нечым абмежаваныя. Калі я працаваў над праектам, хацеў сабраць усе музеі свету, але гэта досыць складана, мне трэба было б з пятнаццаці гадоў пачаць вандраваць і збіраць матэрыял».

**Сёння ў праекце ўжо пяцьдзясят дзве структурныя часткі, таму не дзіўна, што на сцяне ў Нацыянальным мастацкім Вавілонская вежа Альшэўскага проста не змясцілася.**

Як партрэтыст мастак выяўляецца ў праекце «Партрэт сучасніка», прысвечаным знакавым беларускім персонам, а чацвёртым састаўным праектам «Кропкі адліку» з'яўляецца прысвячэнне Мінску, якім яго бачыць аўтар.

«Кропка адліку» ўмяшчае ў сябе маштабныя — і па ідэях, і па памерах — работы, што аб'ядноўваюць мінулае і кантрастнае сучаснае, высокае мастацтва і кітч, артэфакты і новую культуру. Выстаўка ў Нацыянальным мастацкім сапраўды ўвабрала ў сябе помнікі культуры з усяго свету, толькі не прывезла іх з высокімі мытнымі пошлінамі, а стварыла з іх прысутнасці сваю канцэпцыю. Экспазіцыя твораў Віктара Альшэўскага будзе выстаўляцца да 30 верасня.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ**

■ Кінакрокі

## Юлія ШАТУН:

# «Прыдумаць гісторыю нашмат лягчэй, чым паспрабаваць адрэфлексаваць рэальнасць»

**У пракат выйшла яшчэ адна ў нейкім сэнсе беспрэцэдэнтная беларуская карціна — «Заўтра» Юліі Шатун, якая стала найлепшым іграввым фільмам Нацыянальнага конкурсу кінафестывалю «Лістапад», героем кінакрытыкаў і ўладальнікам чатырох узнагарод кінафестывалю ў Марселі. Вытрыманая, мерная, эстэцкая стужка расказвае пра будні сям'і — яе сыграла сям'я аўтара, — якая жыве ў невялікім беларускім гарадзе, робіць рамонт, падпрацоўвае, набывае куртку сыну ў растэрміноўку і жыве, здаецца, амаль аўтаматычна. Мы сустрэліся з рэжысёрам і перш за ўсё запыталіся, як французская публіка ўспрыняла «Заўтра» ў Марселі.**



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

— Мяне здзівіла, што ў некаторых момантах гледачы смяяліся. Напрыклад, падчас сцэны, дзе мае героі разглядваюць фотаздымкі з курорта, што зразумела, бо Марсель вельмі падобны на тое, аб чым тыя мараць. Гэта ўсё роўна, што мы б убачылі, як нейкі француз марыць пра Беларусь і разглядвае фотаздымкі зімовага Мазыра. У іх таксама мора, пальмы, кінатэатр, дзе паказваўся фільм, знаходзіцца на беразе мора. Астатнія моманты я не запомніла, але на прэс-канферэнцыі мне задавалі пытанні, як я працавала з гумарам. Разумею, што яны мелі на ўвазе: гумар у трагічнай жыццёвай сітуацыі, накшталт Акі Каўрысмякі, нават не гумар, а абсурд, а я лічу, у нас хапае абсурду. Канешне, некаторыя прывычныя для нас рэчы для іх смешныя, хаця я такога не чакала. Водгукі былі добрыя, я не думаю, што людзі ў залежнасці ад нацыянальнасці моцна адрозніваюцца. Іх закранулі нейкія ўніверсальныя каштоўнасці, блізкія ўсім: любоў, жыццё, людзі.

***— Наколькі я ведаю, «Заўтра» выйшла ў пракат у крыху перайначаным выглядзе.***

— Так, але акрамя мяне і некалькіх людзей гэта ніхто не заўважыць. Мы крыху палепшылі гук, і фільм стаў даўжэйшы на дванаццаць хвілін, але гэта не ўплывае на сюжэт. Мы рассыпалі сцэны па ўсёй карціне дзеля хронаметражу. Калі яна была 63 хвіліны, на некаторых фестывалях магла нават не трапіць у катэгорыю поўнага метра, і для пракату гэта зручней. Я разумею: да кароткага кіно ставіцца як да такога «неда», для паўнавартаснасці сеанса хочацца нешта дабавіць. Мы зрабілі так, што змены не адчуваецца, не тое каб нешта прыляпілі.

***— У адным з інтэрв'ю ты сказала, што ў кіно табе цікавая рэалістычнасць. Але рэалістычнасць не заўсёды азначае, што ты паказваеш рэальнасць. Ці была ў цябе свядомая прэтэнзія яе адлюстраваць?***

— Вядома ж, я цаню рэалістычнасць, але не толькі, не ўсё кіно павінна быць такім. Дакументальнае — дакладна павінна, бо заяўляецца як дакумент, чаму мне і не падабаецца і падаецца крыху несумленным, калі для дакументальнага фільма просяць разыграць нейкую сітуацыю, бо мала здымачных дзён. Што датычыцца мастацкага кіно, нават тое, што называецца аўтарскім, не мусіць быць рэалістычным у рэчышчы Румынскай хвалі, у кожнага аўтара свая мова. Больш важна быць сумленным, а як ты гэта ўвасобіў — іншая справа. Адчуванне, што ты глядзіш нешта дакументальнае, не абавязковае. Ці была ў мяне прэтэнзія на адлюстраванне рэальнасці, я пра гэта проста не думала. Тут быццам нічога і не прыдумана, бо мне гэта нецікава. На мой погляд, прыдумаць нейкую гісторыю нашмат лягчэй, чым паспрабаваць адрэфлексаваць рэальнасць. Мне хацелася папрацаваць з навакольным светам, з вобразамі са свайго жыцця.

***— Гэта дзіўна, таму што вобраз жыцця ў Беларусі тут падаецца настолькі прадуманым.***

— Натуральна, я ўсё прадумала, проста не ўяўляла, што гэта павінен быць пэўны жанр ці нешта яшчэ. Мне захацелася расказаць такую гісторыю. У наступны раз, напэўна, захочацца расказаць іншую.

***— Нават калі твой фільм несвядома стварае гэты вобраз, усё роўна маніпулюе рэальнасцю: калі ты нейкім чынам яе адлюстроўваеш, так ці інакш паказваеш нейкі бок навакольнага свету, бо ён ніколі не будзе ўніверсальным для ўсіх. Ты гэта ўсведамляеш?***

— Часцяком я думаю, наколькі этычна называць дакументальнае кіно дакументам, — напэўна, не варта, таму што, калі робіш мантаж, ты ўжо страчваеш магчымасць паказаць жыццё ў выглядзе дакумента. Любое мастацтва маніпулятыўнае, бо мы ствараем вобразы. Калі нехта да цябе прыходзіць і расказвае нейкую гісторыю, ён таксама маніпулюе, бо расказвае са свайго пункту гледжання. Тое ж самае з кіно: я быццам расказала сваю гісторыю.

**«Мне падаецца, удзельнічаць у конкурсах сорамна, калі ты не проста станцаваў, а быццам нешта сказаў пра свет і сам сябе надзяліў правам пра яго гаварыць».**

***— Ты стварыла вобраз краіны, які датычыцца амаль дзесяці мільёнаў чалавек, ты ў нейкім сэнсе адказваеш за сваю маніпуляцыю.***

— Калі я рабіла фільм, не думала, што некаму буду яго паказваць. Таму, мне падаецца, я ніколі больш не буду такой шчырай. Я нават думала: калі зноў буду рабіць кіно пра беларускае жыццё, не трэба яго тут паказваць, бо яно на другім месцы пасля дакументальнага з пункту гледжання адказнасці за героя. Атрымліваецца, ты ім скарыстаўся. Мне здаецца, менавіта каб пазбегнуць гэтай адказнасці, шмат хто любіць здымаць гістарычныя драмы. Я такія фільмы не люблю, бо мастак павінен — можа, гэта надта катэгарычнае меркаванне — рэагаваць на тое, што ёсць тут і цяпер, бо потым застануцца толькі казкі. Я не збіралася браць на сябе гэтую адказнасць і паказваць «Заўтра» ў кінатэатры. Мне да гэтых часоў няёмка, што нехта прыйдзе і ўбачыць, што я прэтэндую на нейкую праўду, хаця я не ўпэўнена сама ў сабе, у гэтым фільме і ва ўсім, што вакол мяне.

***— Ты чытала крытыку пра твой фільм? Яна цалкам станоўчая, гэта павінна пазбавіць цябе пачуцця няёмкасці.***

— Мне падаецца, удзельнічаць у конкурсах сорамна, калі ты не проста станцаваў, а быццам нешта сказаў пра свет і сам сябе надзяліў правам пра яго гаварыць. Мне няёмка, бо я не збіралася выносіць «Заўтра» вонкі, а атрымалася, як атрымалася. Мне прыемна, што ў нас з крытыкамі супала нейкае адчуванне, але перад гэтымі людзьмі мне таксама няёмка, складана патлумачыць, чаму. Мне ў прынцыпе большую частку жыцця няёмка, асабліва калі нехта траціць свой час на тое, што я зрабіла.

***— Ці ёсць асаблівы сэнс у прэсным візуальным баку фільма?***

— Гэта тое, што мне падабаецца. Усе скардзяцца на «шэрасць» Мінска, а я гэта, наадварот, абажаю, у мяне проста такі густ, гэта падаецца мне самым цудоўным. Я люблю розныя адценні шэрага і з пункту гледжання эстэтыкі не люблю лета, шмат зялёнага колеру, хоць летам здымаць лягчэй з-за доўгага светлавога дня і цеплыні. «Заўтра» здымаць было складана: холадна і ўвесь час мянялася асвятленне, але наваколле па танальнасці і нейкай чысціні падыходзіла для таго, каб расказваць пра Мазыр.

***— Чаму ў выніку твой герой вырашыў не карыстацца магчымасцю?***

— У маім жыцці і жыцці маіх знаёмых шмат абсурдных сітуацый, калі складана знайсці лагічнае тлумачэнне, але думаеш: «Гэта пра нас», хоць я не люблю дзяліць людзей на нацыянальнасці. У мяне было нешта падобнае, калі я паступіла ў кіншколу ў Маскву, але вырашыла не ехаць, таму што там жыццё даражэйшае. Я і цяпер маю сумненні, хоць мне прапанавалі ўжо бясплатна вучыцца ў гэтай жа кіншколе: не ведаю, што ім пісаць, спадзяюся, мне не напішуць, маўляў, прабачце, перабор, усе такія таленавітыя, для вас няма месца. Хоць, з іншага боку, так мне было б спакайней, што гэта не я сама адмовілася ад шанцу. Не так даўно бачылася з сябрам-кампазітарам, ён сказаў, што дзесяць гадоў таму таксама паступіў у прэстыжную музыкальную акадэмію ў Стакгольме, у яго сям'і нават былі зберажэнні, але ён падумаў: «З'еду, растрачу ўсе грошы, навошта гэта трэба?». Мая маці расказвала пра сваю стрыечную сястру: яе сын набраў вельмі добры бал на ЦТ, хацеў вывучаць замежныя мовы ў Мінску, спакойна мог прайсці на бюджэт. А яна сказала: «Ой, не, я адна, ногі хворыя, мы яго там не вывучым». У выніку са сваім высокім балам ён паступіў у мясцовы пед і цяпер адпрацоўвае ў школе, хоць у яго магло быць зусім іншае жыццё. Мы баімся магчымасцяў. Гэта гісторыя ў тым ліку пра мяне, і проста шкада, ну, самой сябе мне не вельмі шкада, але іншых людзей вельмі.

**«Калі нехта да цябе прыходзіць і расказвае нейкую гісторыю, ён таксама маніпулюе, бо расказвае са свайго пункту гледжання».**

***— Колькі ў тваім фільме беларускай ментальнасці?***

— Складана сказаць, бо я за ўсім назіраю знутры, а не збоку. Яшчэ адна з прычын, чаму я не хачу ехаць у Маскву, — мне падаецца, калі жывеш тут: усё, што ты робіш, аўтаматычна становіцца параджэннем таго, што цябе фарміруе і што ты бачыш вакол. Калі б я хацела зрабіць класічны амерыканскі ці французскі фільм, у мяне б не атрымалася. Усё, што мы робім, ужо беларускае.

***— Ты казала, што ў фільме шмат сцэн з жыцця. Што гэта за сцэны?***

— Я ўвесь свой фільм быццам бачыла ў жыцці. Як герой тэлефануе і шукае працу — я і сама гэта рабіла і чула. Як ён раскідвае лістоўкі — насамрэч я, калі жыла ў Мазыры, гэтым займалася, а мой бацька падпрацоўваў па-іншаму. Пра «падарыць шпалеры» — тут наш вечны рамонт, на ўсе святы мы дарылі нешта для дому. У гэтую краму мы хадзілі і правяралі, ці не зніклі абраныя намі шпалеры, якія мы пакуль не маглі купіць. Выдуманая штука — толькі з латарэйным білетам, але гэта ж таксама бывае, проста з намі не здаралася. Фільм складаецца вось з такіх моманцікаў, крыху трансфармаваных.

***— Наколькі ты згодна з меркаваннем, што ў тваім фільме паказваецца постапакаліпсіс, дзе людзі не жывуць, а выжываюць?***

— Для мяне, шчыра кажучы, гэта не так. Не тое каб я прыехала ў вёску і здымала яе жыццё збоку — я здымала тое, што ведаю. Мы сапраўды жылі — гэта цяпер мы з братам працуем, потым бацькі былі на заробках — горш, чым мае героі. Мы не маглі дазволіць сабе схадзіць у рэстаран і многія іншыя рэчы. Бывала, мы карысталіся адным праязным на сям'ю — проста ездзілі па чарзе. Альбо, каб сэканоміць грошы, бацькі нават зімой хадзілі ва ўніверсітэт, дзе працавалі, пешшу. Мазыр — не самы маленькі горад, а 300 рублёў у ім — нармальны заробак, а 500 рублёў — зусім вялікі. Дапусцім, ёсць сям'я з двума дзецьмі — як з такімі заробкамі? Ім трэба ўсё набываць. А калі раптам дзеці паехалі вучыцца, становіцца яшчэ цяжэй. З маёй маці ва ўніверсітэце працавала знаёмая — яе скарацілі, бо з-за дзяцей яна не змагла абараніць дысертацыю, у выніку яна нанялася ў нейкую вёсачку працаваць лабарантам за 70 рублёў. Такія гісторыі, нават горшыя, сапраўды ёсць у жыцці, а ў маім фільме ўсё не надта дрэнна.

***— Ад «Лістапада» і да Марселя ў цябе было шмат магчымасцяў камунікаваць з прафесіяналамі. Ці змагла ты ўзяць нешта карыснае з гэтых размоў?***

— Што датычыцца фільма, я і так бачыла ў ім памылкі. Мне падаецца, я іх бачу нават больш, чым іншыя. Падрабязна саму карціну я абмяркоўвала толькі з некаторымі. Калі казаць пра нейкія мастацкія моманты, каб усё разумець, мне, можа быць, і не трэба было б яе паказваць. Я ўзяла карысць хутчэй не для творчага разумення кіно, бо тут, мне падаецца, трэба проста глядзець фільмы, а з практычнага пункту гледжання — як удзельнічаць у фестывалях.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Государственному предприятию «БелПСХАГИ»

Лот № 1. Автомобиль «Фольксваген Пассат», регистр. номер 5110 ВР-5. 2007 г. в. Тип ТС – легковой седан. Цвет – серебристый. Пробег – 346 180 км. Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Прилуки, ул. Мира, д. 1а. Начальная цена, бел. руб. (с учетом НДС) – 4 841,10. Задаток – 485,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения открытого аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Объект в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 16.10.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** Государственное предприятие «БелПСХАГИ», 223011, Минский район, аг. Прилуки, ул. Мира, дом 1а, тел. 8 (017) 509-24-18.
**Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №__), принадлежащего Государственному предприятию «БелПСХАГИ», проводимом 16.10.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7.
**Окончание приема заявлений:** 12.10.2018 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Ярошевич Михаил Владимирович, тел. 8 (029) 646-87-72

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Промагролизинг»

**Лот № 1**. Магазин «Универсам «Сельмашевский», инв. № 350/С-55967. Назначение: здание специализированное розничной торговли. Площадь – 4079,0 кв. м. Количество этажей – 2. Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки. Местонахождение: Гомельская область, г. Гомель, ул. Дворникова, 7. **Начальная цена** с НДС – 3 550 000,00 бел. руб. **Задаток** – 250 000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 20 000,00 бел.руб.

**Лот № 2.** Санаторий-профилакторий, инв. № 600/С-46902, 1982 г. п. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей. Площадь – 3349,5 кв. м. Количество этажей – 3. Количество подземных этажей – 1. Составные части и принадлежности: трехэтажный кирпичный санаторий-профилакторий с подвалом (А3/к), двумя навесами 1, 2, входом в подвал, крыльцами. Местонахождение: 223028, Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, 72, район д. Подгорье. **Начальная цена** с НДС – 1 560 000,00 бел. руб. Задаток – 100 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 15 000,00 бел. руб.

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

**Лот № 1** расположен на земельном участке площадью 0,6205 га с кадастровым номером 340100000003000069. Целевое назначение земельного участка: для эксплуатации и обслуживания магазин-универсам № 53. Право аренды. Срок действия: по 06.03.2019. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
**Лот № 2** расположен на земельном участке площадью 1,2240 га с кадастровым номером 623681700001000535. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей. Право аренды. Срок действия: по 25.12.2110. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1, Лот № 2 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Лота № 1, Лота № 2 в течение 20 (двадцати) дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Условия оплаты, приобретенного на аукционе Лота № 1, Лота № 2, согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Договором купли-продажи предусматривается возможность рассрочки платежа с минимальным первоначальным взносом с учетом суммы задатка, в размере:
– 1 000 000,00 (один миллион белорусских рублей 00 копеек) по Лоту № 1;
– 250 000,00 (двести пятьдесят тысяч белорусских рублей 00 копеек) по Лоту № 2.
4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,5 % (ноль целых пять десятых процента) от цены продажи Лота № 1, 1,5 % (одна целая пять десятых процента) от цены продажи Лота № 2 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 19.10.2018 в 11.00. Место проведения аукциона: по Лоту № 1: г. Гомель, ул. Артема, 23; по Лоту № 2: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** ОАО «Промагролизинг», 220035, г. Минск, пр. Победителей, 51/2, пом. 30, тел. (017)334-34-35.
**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, тел. (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №__), принадлежащего ОАО «Промагролизинг», проводимом 19 октября 2018 г. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. **Окончание приема заявлений:** 16.10.2018 в 11.00. Контактные лица для осмотра Объектов: Сикорский Денис Геннадьевич, тел.: (017) 203-07-23, (044) 588-30-21, Славщик Наталья Владимировна, тел. (044) 581-88-90

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» считать недействительными:** полис по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН (серия БА) №№ 1430856–1430865, ОСГО ВТС РБ (серия ВВ) №№ 3039380–3039387, Зеленая карта (все страны) серия BY №№ 13470233–13470235, квитанция 1-СY серии СВ №№ 4432696–4432700.

## ИЗВЕЩЕНИЕ

### о проведении 19 октября 2018 г. открытого аукциона по продаже изъятого по Указу Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 г. № 87 не завершенного строительством жилого дома и права заключения договора аренды земельного участка сроком на 99 лет для строительства и обслуживания не завершенного строительством жилого дома в Клейниковском сельсовете Брестского района

| № лота | Предмет аукциона | Местоположение объекта | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством не законсервированный жилой дом в виде капитального строения наружной площадью 126 кв. м, готовностью основного строения 21 % и право заключения договора аренды земельного участка сроком на 99 лет с кадастровым номером – 121281204601000689 площадью 0,1507 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Брестская обл., Брестский р-н, аг. Клейники, ул. Чистая, 17 | **17659,49**<br>в том числе:<br>7822,82 - начальная цена не завершенного строительством жилого дома;<br>9652,34 – начальная цена права заключения договора аренды земельного участка;<br>184,33 – сумма расходов на оценку стоимости не завершенного строительством жилого дома | **1765,95** | 1. 73,50 – затраты на регистрацию участка.<br>2. Оплата за объявления в СМИ по актам выполненных работ |

По улице Чистой в аг. Клейники проходят сети газоснабжения, водоснабжения, электрификации.

Аукцион будет проводиться 19.10.2018 в 10.00 по адресу: Брестский район, аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Клейниковского сельисполкома BY59AKBB36410000002881000000 в филиале 100 БОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Брест, код AKBBBY21100, УНП 200177417, назначение платежа – 4002 («задаток за участие в аукционе») задатка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течение десяти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Председатель комиссии по организации и проведению аукциона обеспечивает осмотр предмета аукциона претендентом на участие в аукционе в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Для проведения аукциона необходимо наличие не менее двух участников в отношении предмета аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений 15 октября 2018 года до 17.00.

Контактные телефоны: (80162) 93 41 35, (80162) 93 41 36

## ИЗВЕЩЕНИЕ

### о проведении 19 октября 2018 г. открытого аукциона по продаже изъятого по Указу Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 г. № 87 не завершенного строительством жилого дома и права заключения договора аренды земельного участка сроком на 99 лет для строительства и обслуживания не завершенного строительством жилого дома в Клейниковском сельсовете Брестского района

| № лота | Предмет аукциона | Местоположение объекта | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством не законсервированный жилой дом в виде капитального строения наружной площадью 124 кв. м, готовностью основного строения 4 % и право заключения договора аренды земельного участка сроком на 99 лет с кадастровым номером – 121281204601000695 площадью 0,1592 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Брестская обл., Брестский р-н, аг. Клейники, ул. Чистая, 19 | **11686,10**<br>в том числе:<br>1319,77 – начальная цена не завершенного строительством жилого дома;<br>10196,76 – начальная цена права заключения договора аренды земельного участка;<br>169,57 – сумма расходов на оценку стоимости не завершенного строительством жилого дома | **1168,61** | 1. 73,50 – затраты на регистрацию участка.<br>2. Оплата за объявления в СМИ по актам выполненных работ |

По улице Чистой в аг. Клейники проходят сети газоснабжения, водоснабжения, электрификации.

Аукцион будет проводиться 19.10.2018 в 10.00 по адресу: Брестский район, аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Клейниковского сельисполкома BY59AKBB36410000002881000000 в филиале 100 БОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Брест, код AKBBBY21100, УНП 200177417, назначение платежа – 4002 («задаток за участие в аукционе») задатка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течение десяти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Председатель комиссии по организации и проведению аукциона обеспечивает осмотр предмета аукциона претендентом на участие в аукционе в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Для проведения аукциона необходимо наличие не менее двух участников в отношении предмета аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений 15 октября 2018 года до 17.00.

Контактные телефоны: (80162) 93 41 35, (80162) 93 41 36

## ООО «Центр Белинвентаризация»

**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**
- ✓ **Оценка всех видов собственности**

**Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества СП ОАО «СПАРТАК», тел. 8 (0232) 30 44 39**

| № лота | Наименование объекта |
|---|---|
| 1 | **База отдыха «Зеленый луг»** в составе:<br>– Капитальное строение (спальный корпус) с инв. № 310/С-24167 площадью 1125,6 кв. м (составные части и принадлежности: цветник-терраса площадью 40,6 кв. м, бетонная площадка площадью 21,8 кв. м, автомобильная дорога площадью 592,1 кв. м, тротуарная плитка площадью 757,7 кв. м, бетонное покрытие площадью 230,3 кв. м, асфальтовое покрытие площадью 1024,4 кв. м). – Капитальное строение (столовая, клуб) с инв. № 310/С-24169 площадью 620,4 кв. м (составные части и принадлежности: статуя медведей). – Капитальное строение (домик № 1) с инв. № 310/С-24163 площадью 95,4 кв. м. – Капитальное строение (домик № 2) с инв. № 310/С-24164 площадью 14,6 кв. м (составные части и принадлежности: низковольтная кабельная линия (кабель АПВБ 3х95+1х35=195 м, кабель АКВГ 3х6+1х25=170 м, кабель АВВГ 4х35=130 м)). – Капитальное строение (домик № 3) с инв. № 310/С-24161 площадью 61,1 кв. м (составные части и принадлежности: пристройка площадью 9,7 кв. м). – Капитальное строение (домик № 4) с инв. № 310/С-24162 площадью 61,9 кв. м (составные части и принадлежности: пристройка площадью 9,9 кв. м). – Капитальное строение (домик № 5) с инв. № 310/С-24165 площадью 92,3 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичная пристройка площадью 51,0 кв. м, бетонная площадка площадью 48,8 кв. м). – Капитальное строение (домик № 6) с инв. № 310/С-24166 площадью 61,1 кв. м (составные части и принадлежности: пристройка площадью 9,8 кв. м). – Капитальное строение (сарай № 1) с инв. № 310/С-24159 площадью 96,9 кв. м. – Капитальное строение (сарай № 2) с инв. № 310/С-24158 площадью 118,3 кв. м. – Капитальное строение (овощехранилище) с инв. № 310/С-24160 площадью 52,6 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичная пристройка площадью 6,7 кв. м). – Капитальное строение (котельная) с инв. № 310/С-24171 площадью 84,7 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичная дымовая труба, кирпичные дымоходы). – Капитальное строение (уборная) с инв. № 310/С-24157 площадью 10,2 кв. м. – Капитальное строение (баня) с инв. № 310/С-24170 площадью 142,4 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичная пристройка площадью 3,6 кв. м, кирпичный тамбур площадью 2,8 кв. м). – Капитальное строение (насосная) с инв. № 310/С-38866, площадью 10,9 кв. м (составные части и принадлежности: площадка площадью 1,5 кв. м). – Капитальное строение (водонапорная башня) с инв. № 310/С-38867 площадью застройки 4,0 кв. м, высотой 1830 м (состоит из стального бака, ж/б и металлических колонн). – Сооружение (канализация) с инв. № 310/С-55345 протяженностью 628,7 м, 38 колодцев. – Сооружение (водопровод) с инв. № 310/С-55346 протяженностью 866,6 м, 20 колодцев. – Охранно-пожарная сигнализация, инв. № 2168 (бух.), 2003 г. в экспл., состоит из: ПКП-8/16(В2) – 1 шт. извещатель пожарный ручной ИПР – 10 шт. извещ. пож. дымов ИП-212-02 – 154 шт., извещ. пож. тепл. ИП-109-2 – 26 шт. сирена внутренняя SOSB1 – 5 шт. – Система пожарной сигнализации и оповещения, инв. № 2171 (бух.), 2008 г. в экспл., состоит из:. ППКОП А16-512 – 1 шт., модуль АР-16 – 1 шт., извещ. пож. ИП5-02Т – 17 шт., извещ. пож. дымов. ИП-212-77Т – 102 шт., извещ. пож. тепл. ИП-101-А2М-1 – 6 шт., прибор упр. сист. оповещ. Танго-ПУ/БП-16 – 1 шт., зональный коммутатор Танго ПУ/ЗК – 8 шт., транспарант АСТО-12/1-33 шт. светозвуковой оповещ. АСМ-04/1 – 58 шт. – Узел учета тепла, инв. № 2172 (бух.), 2008 г. в экспл., теплосчетчик ТЭМ-104. – Счетчик расходомер «Взлет-МР», инв. № 2173 (бух.), состоит из: вторичный преобразователь, 1 шт.; измерительный участок (ИУ) с ответными фланцами, 1 шт.; ПЭА (врезные в комплекте с ИУ), 2 шт.; имитаторы врезных ПЭА, 2 шт.; источник вторичного питания ~220/=24В 24(30)Вт 24В, 1 шт.; кабели связи на ПЭА, 10 м. – Незавершенное законсервированное строение (скважина № 54410/12) с инв. № 310/U-46892, 40,39 % готовности (составные части и принадлежности: фильтр, надфильтровая труба, отстойник, оголовок скважины).<br>*Объекты расположены:* на зем. уч. с кадастровым номером 321087606140000001 площадью 0,5255 га, зем. уч. с кадастровым номером 321087606140000002 площадью 0,0144 га, зем. уч. с кадастровым номером 321087606140000003 площадью 0,0402 га, зем. уч. с кадастровым номером 321087606140000004 площадью 0,0783 га, зем. уч. с кадастровым номером 321087606140000005 площадью 0,0965 га, зем. уч. с кадастровым номером 321087606140000007 площадью 3,5086 га. Ограничение в использовании земельных участков общей площадью 4,2635 га в связи с их расположением в водоохранной зоне р. Сож. Земельный участок с кадастровым номером 321087606104000008 площадью 0,2916 га для строительства артскважины, без права вырубки деревьев, ограничение в использовании в связи с расположением в водоохранной зоне.<br>**Адрес объектов: Гомельская обл., Гомельский р-н, Терюхский с/с, 11, база отдыха «Зеленый луг»** |

**Начальная стоимость лота – 136 491,64 бел. руб. с НДС. Сумма задатка – 13 649,16 бел. руб.**

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 24 сентября 2018 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **26 сентября 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71BPSB30121783390109330000 в РД №300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266.<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация».<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 15.09.2018 г. |
| **Условия продажи** | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Стоимость лота, сформированная на аукционе, должна быть выплачена в течение 30 (тридцати) рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 04.11.2017 г. |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел. (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Пуховичинефтепродукт»

**Лот №1:** Полуприцеп специальный цистерна ПП 9609-0000010, 2003 г. в. Тип ТС – полуприцеп специальный цистерна. Кузов (рама) X8996090031AE4021. Пробег 459 813 км. **Местонахождение**: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Октябрьская, 62. **Начальная цена с НДС – 9 375,60 бел. руб. Задаток – 937,56 бел. руб. Шаг аукциона** – 5 %

**Аукцион состоится 28.09.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Условия аукциона содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец**: ОАО «Пуховичинефтепродукт», 222811, Минская обл., г. Марьина Горка, ул. Октябрьская, д. 62, тел. 8 (01713) 35-411.
**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №_), принадлежащего ОАО «Пуховичинефтепродукт», проводимом 28 сентября 2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений** 26.09.2018 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Курленко Иван Семенович, тел. 8 (029) 2152255.
Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 10.07.2018

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ТЭСТ ДЛЯ «ТРЭ КРУНУР»



## Што чакае Швецыю?

**У Швецыі прайшлі парламенцкія выбары, па выніках якіх кіраўнічы левацэнтрысцкі блок набраў 40,6 працэнта галасоў, а правацэнтрысцкая апазіцыя атрымала толькі на 0,3 працэнта менш. У той жа час за ўльтраправую партыю «Шведскія дэмакраты» (ШД), якая не ўваходзіць ні ў адзін блок, прагаласавалі 17,6 працэнта выбаршчыкаў, што амаль на пяць працэнтаў больш, чым на папярэдніх выбарах. ШД фактычна атрымалі «залатую акцыю» і ўжо заявілі пра гатоўнасць сфарміраваць кааліцыйны Дзяржаўны савет караля (так афіцыйна называецца ўрад гэтай скандынаўскай кастытуцыйнай манархіі, у якой на гербе тры кароны — «трэ крунур»). У аднапалатным шведскім парламенце (рыксдагу) 349 дэпутатаў, якія «заступаюць на працу» на чатыры гады. Па выніках апошніх выбараў 2014-га ў краіне быў сфарміраваны ўрад меншасці з удзелам сацыял-дэмакратаў і «зялёных». Што чакае шведаў на гэты раз?**

### Хот-дог у булачцы

Зусім нядаўна вуліцы шведскіх гарадоў былі залепленыя разнастайнымі перадвыбарнымі плакатамі. Восем парламенцкіх партый змагаліся за галасы выбаршчыкаў. Кампанію галоўнай партыі краіны, Сацыял-дэмакратычнай рабочай (СДРПШ), якая нязменна сярод лідараў на любых выбарах і кіравала Швецыяй 74 гады за мінулае стагоддзе, узначальваў прэм'ер-міністр Стэфан Лёвен. У перадвыбарчым роліку партыі ён спыняецца каля кіёска фастфуду. На пытанне прадаўца «Што вы хочаце?», прэм'ер адказвае: «Я хачу грамадства, дзе надзейнасць важнейшая за зніжэнне падаткаў; каб мы маглі наняць больш медыцынскага персаналу і дапамога заўсёды паспявала своечасова; каб грамадства рабіла больш для моладзі, якая не была б у палоне ў крыміналу; я хачу, каб тыя, хто скончыў прафесійнае жыццё, атрымлівалі пенсію, на якую можна жыць; каб падаткі, якія мы плацім, ішлі сюды, — Стэфан паказвае на дзяцей, якія гуляюць, — а не ў кішэні спекулянтаў і капіталістаў; так, і яшчэ я хачу хот-дог у булачцы. А што хочаш ты?».



Маргот Вальстром, міністр замежных спраў і адзін з лідараў сацыял-дэмакратычнай партыі, заўважала з тысяч перадвыбарчых афіш: «Я не хачу, каб памер твайго кашалька вызначаў, якую медыцынскую дапамогу ты атрымаеш». Відавочна, што яна кажа не пра сябе. Яе праблемы бясплатнай медыцыны не кранаюць. Як адзначылі шэраг экспертаў, займеннік «ты» замест «мы» ў дадзеным выпадку сапраўды вызначае сітуацыю, якая склалася: кар'ерныя палітыкі і лідары кіраўнічай партыі — гэта частка істэблішменту, якая даўно адарвалася ад народа і ўжо нават не ўяўляе сябе яго часткай.

Без малога стагоддзе Швецыя была сусветнай сталіцай сацыял-дэмакратыі. Яшчэ дваццаць гадоў таму гэтая імперыя была ў зеніце ўплыву: сацыялісты былі ва ўладзе ў 11 з тагачасных 15 краін ЕС. Цяпер такіх дзяржаў засталося толькі 5 з 28. А днямі мы сталі сведкамі таго, як сацыял-дэмакратычны праект захістаўся ў сваёй уласнай цвярдыні. Да 1991 года ў СДРПШ было больш за мільён членаў, а зараз партыйных сацыял-дэмакратаў засталося крыху больш за 100 тысяч. Пасля ўвядзення ўсеагульнага выбарчага права партыя нязменна набірала на выбарах ад 40 да 55 працэнтаў галасоў, цяпер яна атрымала ўдвая менш. А сярод грамадзян маладзейшых за 50 гадоў партыйны рэйтынг ледзь дасягае 20 працэнтаў.

### Рэцэпт ад «памяркоўных»

Галоўны апанент сацыял-дэмакратаў — ліберальна-кансерватыўная Умераная кааліцыйная партыя (Moderaterna) — узначальвае альянс з чатырох правых «буржуазных» партый. Яна ўдзельнічала ў выбарах на чале з новым лідарам. Ульф Крыстэрсан настроены даволі радыкальна. Ён адкрыта паказвае на пагрозы, з якімі сутыкаецца нацыя: мігранты, беспрацоўныя, саіскальнікі сацыяльных дапамог, маладзёжныя банды і людзі без адукацыі. Крыстэрсан абяцаў хутка навесці парадак цвёрдай рукой.

Фактычна яго кампанія будавалася на распальванні страхаў сярэдняга класа перад пагрозамі з боку «небяспечных класаў». Ён абяцаў разарваць з логікай «сацыяльнага паразітызму», скарацўшы «залішнія» сацыяльныя праграмы для беспрацоўных, некваліфікаваных і сацыяльна неабароненых. «Трэба ўносіць уклад у развіццё, а не атрымліваць дапамогі» — сцвярджаў адзін са слоганаў правых. «Памяркоўныя» маюць намер перамагчы крымінал не з дапамогай сацыяльнай палітыкі, а павялічваючы колькасць паліцэйскіх і павышаючы патрабаванні да мігрантаў і саіскальнікаў дапамог. Рэцэпты Крыстэрсана адсылаюць да каштоўнасцяў класічнага кансерватызму: закон і парадак, больш ніякай валтузні з залішнім гуманізмам.

«Працягваць пазітыўнае развіццё!» — абвяшчалі перадвыбарчыя афішы «памяркоўных» у прэстыжных катэджных раёнах. «Наперад!» — лаканічна камандавала Ані Лёф, лідар саюзнай ім Партыі цэнтра. Адзінай аўдыторыі правых лібералаў і кансерватараў ясна, што краіна рухаецца ў правільным напрамку: паспяховая частка грамадства выйграе ад росту няроўнасці і дэмантажу рэшткаў «шведскага сацыялізму».

Кіраўнік правацэнтрысцкага альянсу заклікаў урад Швецыі па выніках выбараў пайсці ў адстаўку. «Гэты ўрад вычарпаў сябе, — адзначыў Крыстэрсан. — Альянс большы за чырвона-зялёны блок». У сваю чаргу прэм'ер-міністр Швецыі Стэфан Лёвен абвясціў, што не мае намеру ісці ў адстаўку. «Да адкрыцця сесіі новага парламента засталося два тыдні. Я застаюся на гэты час на пасадзе прэм'ер-міністра», — адзначыў кіраўнік урада. Ён таксама назваў вечар падвядзення вынікаў галасавання пахаваннем палітыкі блокаў.

### Вірлівы перыяд

Спакойная і ўраўнаважаная, эканамічна ўстойлівая і сацыяльна збалансаваная, па-паўночнаму павольная і нават у нейкай ступені меланхалічная Швецыя апошнім часам перажывае «вірлівы перыяд», заўважае iz.ru. Прычынай таму скандынаўскія палітолагі бачаць рэзка ўзрослую актыўнасць партыі «Шведскія дэмакраты», якая стаіць на пазіцыях еўраскептыцызму. Іншыя палітычныя партыі імкнуліся не заўважаць ШД, каб не піярыць сапернікаў, якія, зрэшты, і без павышанай увагі да сябе змаглі падняць сваю квоту ў заканадаўчым органе больш чым утрая — з 5,7 да 17,6 працэнта. Пры гэтым яны да апошняга часу заставаліся партыяй, стварацъ альянсы з якой не імкнулася ніякая іншая буйная палітычная сіла краіны — ні сацыял-дэмакраты, ні эколагі (Партыя зялёных), ні арганізацыі кансерватыўнага тыпу, якія часткова супадаюць па сваіх поглядах з дэмашведамі.

Звяртаць пільную ўвагу на ШД скандынаўскія СМІ пачалі тады, калі ў Брусэлі расчынілі вароты ў ЕС перад лавінай бежанцаў. За пяць гадоў у краіну прыехала звыш 600 тысяч мігрантаў (агульная колькасць насельніцтва краіны складае каля 10 млн чалавек). Па колькасці мігрантаў на аднаго жыхара Швецыя знаходзіцца на другім месцы ў ЕС. 18,5 працэнта насельніцтва нарадзіліся за межамі краіны. Паводле афіцыйнай статыстыкі, у скандынаўскай краіне пражываюць 150 тысяч сірыйцаў, 135 тысяч іракцаў і 71 тысяча іранцаў. Па разліках экспертнай групы па грамадскай эканоміцы, кожны мігрант абыходзіцца ў 74 тысячы крон (8 тысяч долараў) штогод на працягу ўсяго свайго жыцця.

